№ 44 (402) 26 лістапада 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Дамова-2006**
Апазыцыя: перадвыбары да Калядаў.
старонка 10

**Так крочаць да зорак**
22-гадовы драматург напісаў трагедыю для Аляксандра Лукашэнкі.
старонка 2

**Аляксандар Надсан**
Народы Расеі. Урыўкі з новай кнігі.
старонка 14

**Ці гатовыя вы да зімы**
Што апранаць, дзе адпачываць, чым супакоіцца. Тэма нумару.
старонка 8

# Шчэ нэ вмэрла




**Тры дні ва Ўкраіне ішла вайна нэрваў. Улады ня маюць сродкаў, каб задушыць народнае паўстаньне. Дэманстранты ня маюць досыць сілы, каб узяць пад кантроль Адміністрацыю прэзыдэнта, ЦВК і тэлебачаньне. Кучма спадзяецца, што рэвалюцыя выдыхнецца. Ючшанка чакаў, што ўлады ня вытрымаюць ціску і пашыраў «вызваленую зону» ў цэнтры сталіцы. Увечары ў сераду Цэнтравыбаркам абвесьціў Віктара Януковіча прэзыдэнтам. За часоў Краўчука-Кучмы ўладныя кланы скалацілі багацьці, якія ацэньваюцца ў 40 млрд даляраў. Яны ня могуць дапусьціць такой рызыкі для сваіх капіталаў, як заняцьце пасады прэзыдэнта некантраляваным Віктарам Ючшанкам. Украіна — на мяжы рэвалюцыі або дыктатуры.**

## Выйдуць, ня выйдуць?

Экзыт-пол даў Ючшанку 11-працэнтны адрыў ад В.Януковіча. Аб 11-й гадзіне раніцы зьявіліся афіцыйныя зьвесткі ЦВК Украіны, дыямэтральна супрацьлеглыя: паводле іх за Януковіча аддалі свае галасы 49,57% украінцаў, за Ючшанку — 46,57%.

Ад 9-й ранку людзі пачалі зьбірацца на Майдане Незалежнасьці. Перад імі выступіў Віктар Ючшанка і паведаміў, што запатрабаваў склікаць нечарговае пасяджэньне Вярхоўнай Рады, каб на ім дэпутаты аб'явілі недавер ЦВК.

Гарсавет Львова першым прыняў рашэньне прызнаць Ючшанку законным прэзыдэнтам і выконваць яго наказы. Гарсавет Кіева пастанавіў забясьпечыць адпаведныя ўмовы для правядзеньня масавых акцый пратэсту. Рашэньне падтрымалі 75 дэпутатаў, два ўстрымаліся.

Увечары ў панядзелак на мітынг у цэнтры Кіева сабраліся ўжо сотні тысяч чалавек. Улада гэтага яўна не чакала. Не чакала і Масква, Уладзімер Пуцін першы павіншаваў Віктара Януковіча зь перамогай на выбарах.

На 14.00 аўторка прызначана нечарговае пасяджэньне Вярхоўнай Рады. Стала ясна, што апазыцыі ўдалося пазьбегнуць сілавога вырашэньня канфлікту да пад'езду ў Кіеў актывістаў «Сілы народу» з рэгіёнаў.

## Бестэрміновы страйк

У ноч з панядзелка на аўторак працягвала павялічвацца колькасьць намётаў на Храшчаціку. У Кіеў праз кардоны міліцыі і мэталічныя шыпы на дарогах прабіваюцца першыя калёны ючшанкаўцаў з аддаленых рэгіёнаў Украіны.

На ранішні мітынг на Майдане Незалежнасьці ў Кіеве сабралася ўжо каля 150 тыс. чалавек. Дэпутат Мікола Таменка, даверaная асоба Ючшанкі, заклікаў людзей ісьці да парлямэнту.

Апроч Кіева, адбываюцца мітынгі ў падтрымку Ючшанкі ў іншых гарадах Украіны: Харкаве (50 тыс. удзельнікаў), Жытоміры, Віньніцы (30 тыс. удзельнікаў), Адэсе, Запарожжы, Камянцы-Падольскім, Палтаве, Сумах (40 тыс. удзельнікаў), Чаркасах, Луцку, Чарнаўцах (30 тыс. удзельнікаў), Кіраваградзе, Днепрапятроўску ды Львове (100 тыс. удзельнікаў). У Чарнаўцах людзі патрабуюць ад мясцовай рады дэпутатаў падтрымаць рашэньні Львова, Кіева, Івана-Франкоўску, Віньніцы і Цярнопалю.

Бестэрміновы страйк абвясьцілі студэнты й прафэсура Кіева-Магілянскай акадэміі. Рэктар Нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту зачытаў студэнтам рашэньне аб страйку. Рэктар Кіеўскага дзяржунівэрсытэту дазволіў студэнтам прапускаць заняткі, і 5-тысячная калёна на чале з актывістамі «Пары», украінскага «Зубра», выправілася на Майдан Незалежнасьці.

Дырэкцыя аэрапорту «Барысполь» выдзеліла два аўтобусы, каб ахвотныя работнікі маглі паехаць у Кіеў на мітынг. Дырэктара аэрапорту зьнялі яшчэ перад першым турам за нежаданьне фінансаваць кампанію Януковіча.

## Спакойны як удаў

Удзень Віктару Януковічу пазваніў Аляксандар Лукашэнка і павіншаваў яго зь перамогай.

Працяг на старонцы 3.

# Так крочаць да зорак

## П’еса для Адміністрацыі прэзыдэнта

**Кірыла Мельнік — аўтар п’есы «Так крочаць да зорак» — перадаў свой твор у Адміністрацыю прэзыдэнта і чакае адказу.**

**«НН»: Кірыла, Вам яшчэ толькі 22 гады, але Вы ўжо напісалі п’есу «Так крочаць да зорак», героі якой разважаюць пра ролю і значэньне першага прэзыдэнта, пра ягоную важнасьць для душы і сэрца кожнага беларуса. Як увогуле ў Вас зьвілася ідэя гэтай трагедыі ў пяці актах?**

**Кірыла Мельнік:** Гэта была сапраўдная гісторыя майго блізкага сябра — памерла дзяўчына. Так што жыцьцёвы каркас быў узяты з рэальнага матэрыялу нашага часу, і гэта аснова, на якую я ўжо нанізваў усё астатняе.

Наконт звароту да палітычнай тэмы — мой узрост ужо дастаткова сталы. Калі паглядзець на мінулыя стагодзьдзі, то ўсе вялікія мысьляры, вялікія філёзафы былі дасьведчаныя ў палітычнай сытуацыі. Яны непасрэдна выходзілі да каралёў і кіраўнікоў. Толькі ў XX ст. адбылося адмежаваньне касты філёзафаў, пісьменьнікаў ад палітычных вярхоў.

**«НН»: Досьвед мастакоў мінулага падштурхнуў Вас аддаць сваю п’есу ў Адміністрацыю прэзыдэнта?**

**КМ:** Дык гэта вы ўжо ведаеце? Адказу не было пакуль. Там яшчэ было пастаўленае прысьвячэньне: Першаму Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі. Калі ж Аляксандар Рыгоравіч не палічыў неабходным падняць яго на сьвятло, то няхай гэты экзэмпляр і прападзе.

**«НН»: Але, магчыма, Аляксандар Рыгоравіч усё-такі прачытаў Ваш твор. А што, калі Вам адкажуць, што Ваш твор ідэалягічна ня вытрыманы, не кранае глыбінных праблемаў нашага часу? А ў ім сапраўды, дарэчы, не закранутая тэма ўздыму сельскай гаспадаркі, недастаткова гаворыцца пра барацьбу з карупцыяй. Вы як мастак станеце тады перапісваць п’есу альбо будзеце адстойваць створанае?**

**КМ:** У мяне там ёсьць словы, што стыль вялікага майстра — суворы і жорсткі. Дык вось, я настойваю на напісаным, на кожнай косцы гэтай п’есы. Тое, што там напісана, так і застанецца.

А стаўленьне да прэзыдэнта, калі ён будзе весьці такую ж лінію, якую й вядзе — у мяне застанецца станоўчым.

**«НН»: А як паставіўся да п’есы Ваш тата, вядомы аўтар падручніка па дзяржаўнай ідэалёгіі, палкоўнік МУС?**

**КМ:** Яму спадабалася мая п’еса «Адольф Гітлер і Эва Браўн», а гэтай п’есы ён не чытаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

ДАВЕДКА

**Кірыла Мельнік** — сын ідэоляга з МУС Уладзімера Мельніка. Скончыў Мастацкую вучэльню імя Глебава. Мастак, драматург.

**«НН»: Вы цытуеце Гётэ, Байрана, Шэксьпіра…**

**КМ:** …і Освальда Шпэнглера…

**«НН»: …Вы выкарыстоўваеце ненадрукаваныя вершы беларускага аўтара — і дапісваеце да іх свае радкі. Гэта ўплыў постмадэрнізму ці даніна павагі да аўтараў?**

**КМ:** Наконт першых чатырох — гэта даніна павагі, а наконт апошняга — супадзеньне абставінаў. Ён напісаў радкі пра тую дзяўчыну, я палічыў іх добрымі — і сьмела зьмясьціў.

**«НН»: Дзе б Вы хацелі, каб паставілі Вашу п’есу?**

**КМ:** У Купалаўскім тэатры я яе ня бачу — на беларускай мове яна не прагучыць, мо, хіба, калі Купалаўскі пяройдзе на расейскую мову. У Тэатры ім. Горкага пад кіраўніцтвам Луцэнкі я яе абсалютна не ўяўляю. Гутарка будзе ісьці пра Маскву, Пецярбург, пра эўрапейскія пераклады.

**«НН»: Кожны твор — гэта партрэт аўтара. А Вы не баіцеся паказацца такім, які Вы ёсьць?**

**КМ:** Кожны пісьменьнік рызыкуе, кожны актор… Драматургія — гэта не філязофскі трактат, гэта ўсё ж такі гульня. Урэшце, я разумею, што я граю — гэта ж не маё жыцьцё, выкладзенае на паперы. Гэта мастацтва слова, мастацтва камбінацый здарэньняў…

**«НН»: А Вам ня будзе сорамна за тое, што вы напісалі?**

**КМ:** Ляйбніц неяк сказаў, што трэба баяцца толькі таго, што прынясіць шкоду іншым. Людзі, якія прачыталі маю п’есу, казалі, што ім было прыемна, цікава чытаць. Рэжысэр Забалотнікаў сказаў, што гэта лепшае, што выйшла з-пад маёй рукі.

**«НН»: Кожны аўтар ведае, чаго вартыя ягоныя творы. Вы пэўныя, што з гэтай п’есай Вы ўвойдзеце ў гісторыю літаратуры?**

**КМ:** Гэта занадта гучныя словы. Для крытычнага мысьленьня яны не пасуюць…

**Гутарыў Андрэй Расінскі**

# Гісторыя аднаго гораду




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Пасьля эмацыйнага пасажу кіраўніка дзяржавы на адрас «замызганых французжанак» на сталічных бігбордах колькасьць апошніх пачала рэзка зьмяншацца. Цяпер большасьць вулічных рэклямных шчытоў або стаіць пустая, або рэклямуе, напрыклад, правілы дарожнага руху. З дапамогай анімалістычных выяваў. Нелюбоў кіраўніка Беларусі да французжанак стала тэмаю зьедлівых камэнтароў замежных СМІ.**

## Новы «ARCHE»




Рэфэрэндум-2004: канец пераходнага пэрыяду.

Сьвятлана Алексіевіч, Станіслаў Багданкевіч, Пятро Марцаў, Віктар Марціновіч ды іншыя расейскамоўныя інтэлектуалы Беларусі пра моўную рэальнасьць і моўны выбар.

Паводле інфармацыі Рэдакцыі «ARCHE», гэты нумар часопісу ўсё ж будзе прадавацца праз шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

## «ARCHE» шукае

дырэктара-адміністратара на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўвацъ на э-адрас arche@arche.org.by.

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Стары Ольса

**26 лістапада** ў Палацы прафсаюзаў (пр.Скарыны, 25) — юбілейны канцэрт гурту «Стары Ольса» і прэзэнтацыя альбому «Скарбы ліцвінаў». Пачатак а 19-й.

## Шалкевіч

**1 сьнежня** ў Доме літаратара (вул. Фрунзэ, 5) адбудзецца сольны канцэрт вядомага барда і актора Віктара Шалкевіча. Пачатак а 19-й. Квіткі — ад 6000 да 8000.

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

## Зелянкоўская абвяргае

Пасьля публікацыі ў №43 артыкулу «Зелянкоўская ў чорным сьпісе» ў Рэдакцыю патэлефанавала акторка. Сьвятлана Зелянкоўская заўважыла, што ў артыкуле прыведзена недакладная інфармацыя. «Як творчы чалавек, я распавядала «Салідарнасьці» пра «Госьціцу» і карціну Кудзіненкі. Але што тычыцца палітыкі, то газэта скарысталася неправеранымі чуткамі. Прыпісаных мне слоў я не казала».

Прыносім Сьвятлане Зелянкоўскай свае прабачэньні.

## «НН» і «ARCHE» ў Горадні

3 сьнежня ў Горадні адбудзецца сустрэча з **Андрэем Дыньком** і **Валерам Булгакавым**. Пачатак а 18.30, у майстэрні мастака Зьмітра Іваноўскага (Будзённага, 48а, першы паверх). У Горадню прыедуць таксама паэт **Андрэй Хадановіч** і сьпявак **Зьміцер Бартосік**. У сустрэчы возьмуць удзел таксама гарадзенцы — паэт **Юры Пацюпа** і крытык **Даніла Жукоўскі**. Гаворка пойдзе пра гарачыя пытаньні нашага жыцьця.

## Санкцыі супраць лукашыстаў

Эўразьвяз пашырыў візавыя санкцыі супраць беларускіх чыноўнікаў на асобаў, якія, на думку ЭЗ, адказныя за грубае сфальшаваньне выбараў і рэфэрэндуму і грубыя парушэньні правоў чалавека, зьбіцьцё мірных дэманстрантаў — на Лідзію Ярмошыну, Урала Латыпава, міністра Навумава.

## Віза для Вольскага

Лявону Вольскаму ўсё ж выдалі амэрыканскую візу. Пасьля адмовы ў візе й скандалу з гэтай нагоды рок-музыку 22 лістапада запрасілі на паўторнае сумоўе і на наступны дзень выдалі пашпарт з паўгадавой візай. Лявон мяркуе паехаць у ЗША ў сакавіку 2005 г. і дасьць там некалькі дабрачынных канцэртаў.

## Золата пайшло на рэфэрэндум?

Золатавалютныя рэзэрвы Беларусі за кастрычнік скараціліся на 1,8% — да 1006 млн дал. Міжнародныя рэзэрвовыя активы скараціліся на 3,3% (да 637,9 млн дал.), чыстыя замежныя активы скараціліся на 1%. Золатавалютныя рэзэрвы Беларусі скарачаюцца ўжо другі месяц запар.

## Пасткі для бамбілаў

За дзесяць месяцаў супрацоўнікі падатковай інспэкцыі злавілі «на гарачым» 171 таксіста безь ліцэнзіі. Прыбытак дзяржавы склаў 10,3 млн рублёў і 8 сканфіскаваных аўтамабіляў. Надалей, паводле Міністэрства падаткаў і збораў, інспэктары будуць яшчэ часьцей прыкідвацца кліентамі.

## Саранча, я цябе зьем

Духоўныя лідэры Эгіпту заклікалі мусульман актыўней есьці саранчу, падкрэсьліўшы, што іслам гэтага не забараняе. «У час, калі ўлады намагаюцца зьнішчыць саранчу, усім трэба змагацца зь ёй, а не сядзець, склаўшы рукі», — гаворыцца ў звароце. Мо і нам так супраць каларадзкага жука?

**АШ**

# Шчэ нэ вмэрла

Працяг са старонкі 1.

**Побач зь Юшчанкам на Майдане Незалежнасьці ў сераду стаялі баксёр Уладзімер Клычко, сьпявак Алег Скрыпка. Шэсьць цэркваў — усе акрамя праваслаўных Маскоўскага патрыярхату — заклікалі вернікаў адстойваць справядлівыя вынікі выбараў. 200 дыпляматаў МЗС абвесьцілі аб падтрымцы Юшчанкі. Тэлевядучыя «Вестак» УТ-1 абвесьцілі страйк. 12 гарадоў прысягнулі Юшчанку. Першы камандуючы ВМС Украіны адмірал Кожын заклікаў вайскоўцаў выконваць загады прэзыдэнта Юшчанкі. Страйк ахапіў большую частку ўнівэрсытэтаў. Пасрэдніцкую місію прапанаваў прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Квасьнеўскі.**

«Пуцін апынуўся ў кепскай кампаніі. Апроч яго, Януковіча павіншаваў зь перамогай толькі Лукашэнка», — адзначыла gazeta.ru.

Аналітыкі доўгія месяцы не маглі ўразумець. Чаму з тузіну прэтэндэнтаў Кучма выбраў Віктара Януковіча — аднаго з найменш прымальных, двойчы судзімага рэцыдывіста. Падзеі панядзелка—серады далі адказ. Кучмісты прадбачылі радыкалізацыю падзей і выбралі кандыдата, які ня мае тармазоў. Любы іншы паддаўся б напору паўмільённых дэманстрацый.

Для зацьвярджэньня дзённага парадку ў ВР патрэбна прысутнасьць 226 дэпутатаў. Юшчанка заклікаў людзей прыйсьці да ВР, каб змусіць дэпутатаў падтрымаць разгляд пытаньня аб выбарах.

8 вядучых Тэлевізійнай службы навін на канале «1+1» адмовіліся чытаць хлусьню ў этэры. Да іх далучыліся таксама некаторыя журналісты іншых тэлеканалаў.

Моладзевая грамадзкая арганізацыя «Пора» прызначыла на сераду, 24 лістапада, бестэрміновы агульнанацыянальны студэнцкі страйк.

## Лябедзька бярэ слова

На мітынгу ў падтрымку Юшчанкі ад імя дэмакратычных сілаў Беларусі, што «тры дні таму стварылі адзіную кааліцыю», выступае лідэр АГП Анатоль Лябедзька. Над Майданам — дзясяткі бел-чырвона-белых сьцягоў. Пра сваю падтрымку таксама заявіў польскі дэпутат у Эўрапарлямэнце экс-прэм'ер Ежы Бузак. Плошча вітае яго авацыямі.

Украінская апазыцыя прымае зварот да парлямэнтаў і народаў сьвету, у якім заклікае падтрымаць Юшчанку як прэзыдэнта Ўкраіны.

Гарадзкія рады па ўсёй Украіне працягвалі прызнаваць Юшчанку прэзыдэнтам. У аўторак гэта зрабілі дэпутаты Хмяльніцкага, Самбару (Львоўская вобл.), Луцку, Трускаўцу і Драгобычу (Львоўская вобл.), Вышгараду (Кіеўская вобл.), Роўна.

Адбылося пасяджэньне Вярхоўнай Рады, на якім, аднак, прысутнічаў толькі 191 дэпутат. Камуністы, ад якіх залежала наяўнасьць кворуму, адмовіліся браць удзел у рэалізацыі сцэнару, «выпісанага заакіянскімі паліттэхнолягамі».

## Пры-ся-гай!

На пасяджэньні Вярхоўнай Рады Юшчанка паведаміў уласныя вынікі выбараў. Штаб Юшчанкі зафіксаваў 11 110 парушэньняў закону падчас другога туру. У другім туры ў Данецкай вобласьці колькасьць выбарцаў павялічылася на 500 тыс. «Дзе яны парадзяліся за тры тыдні?» — рытарычна пытаецца Юшчанка. Тым ня менш, паводле падлікаў штабу Юшчанкі, нават з улікам гэтых фальсыфікацый кандыдат ад апазыцыі перамагае зь перавагай у 1%, у адпаведнасьці з копіямі пратаколаў «з мокраю пячаткаю».

Ход пасяджэньня быў перарваны вэтэранам украінскае палітыкі, былым дысыдэнтам Ігарам Юхноўскім, які выйшаў на трыбуну з украінскай рэліквіяй — асобнікам Астроскае Біблії — і прапанаваў Віктару Юшчанку прынесьці прэзыдэнцкую прысягу. «Пры-ся-гай! Пры-ся-гай!» — скандуюць дзясяткі тысяч дэманстрантаў пад сьценамі Рады і ў Марыінскім парку. Сьпікер Уладзімер Літвін выгуквае «Не пeратварайце ўсё ў камэдыю!» і абвяшчае пасяджэньне закрытым, тэлетрансьляцыя перапыняецца. Віктар Юшчанка кладзе руку на Біблію, прысягае «на вернасьць украінскаму народу», цалуе кнігу. Яму дораць букет аранжавых кветак, прысутныя дэпутаты сьпяваюць нацыянальны гімн. 200 тысяч яговых прыхільнікаў трыюмфуюць, зьмінаюць шэрагі спэцназаўцаў і спрабуюць выбіць браму Рады. З акон іх вітаюць паплечнікі Юшчанкі і журналісты з аранжавымі сьцягамі. Паплечнікі самі разгубленыя — яны не чакалі такога павароту падзеяў.

Юшчанка і ягонае найбліжэйшае кола — Юлія Цімашэнка і віцэ-сьпікер Аляксандар Зінчанка — бяруць ініцыятыву ў свае рукі і прысьпешваюць падзеі. Кучмісты разгубленыя. Яны хацелі б зацяжкі часу, перамоваў. Ці падзе Адміністрацыя прэзыдэнта Ўкраіны на Банковай?



AP

## Боршч з чыстых рук

Жыхары Кіева прыносяць удзельнікам мітынгу ежу і цёплую вопратку. Асабліва кранаюць бабулькі, што прыносяць каструлі з баршчом. Сацыяліст Юры Луцэнка, камэндант намётавага стану, распараджаецца: у мэтах прадухіленьня інцыдэнтаў браць ежу толькі з рук вызначаных людзей, якія перад раздачай абавязаныя праходзіць дэзынфэкцыю.

ЗША не прызнаюць украінскіх выбараў. Міхаіл Саакашвілі зьвяртаецца па-ўкраінску з словамі падтрымкі да ўкраінскага народу.

Прэс-сакратар МЗС Маркіян Лубкіўскі заявіў пра «поўную і безагаворачную падтрымку» Віктара Юшчанкі і агучвае адпаведную заяву, падпісаную 150 дыпляматамі замежнапалітычнага ведамства.

Кіраўнікі ўсіх хрысьціянскіх цэркваў Украіны, акрамя праваслаўных Маскоўскага патрыярхату, выказалі занепакоенасьць з нагоды масавых фальсыфікацый падчас выбараў і заклікалі вернікаў бараніць справядлівыя вынікі галасаваньня. Зварот да народу Ўкраіны падпісалі патрыярх Філарэт, кардынал грэка-каталікоў Любамір Гузар, біскуп Царквы хрысьціян веры эвангельскай Міхаіл Паночка, намесьнік старшыні Канфэрэнцыі рыма-каталіцкіх біскупаў Маркіян Трафім'як, біскуп Хрысьціянскай эвангельскай царквы Леанід Падун.

Тымчасам на стадыёне «Дынама» адбываецца футбольны матч «Дынама»—«Рома». Гледачы, у якіх на ўваходзе сканфіскавалі ўсю аранжавую сымболіку, воплескамі сустракаюць замену чорна-белага мяча на аранжавы — чорна-белага было не відаць на сьнезе. Кіеўская каманда амаль адразу пасьля замены размочвае браму гасьцей і перамагае зь лікам 2:0.

Дэманстранты выпраўляюцца да Адміністрацыі прэзыдэнта, атачыўшы яе з трох бакоў. Там іх чакаюць пятнаццацішарагавыя кардоны данецкіх і крымскіх «барсаўцаў». Ва ўнутраным двары дзяжураць спэцгрупы ў масках з аўтаматамі.

Юлія Цімашэнка залазіць на грузавік зь пяском, што блякуе дарогу, і ўгаворвае амонаўцаў расступіцца. Яе прапускаюць у будынак Адміністрацыі. Правёўшы тамака пэўны час, яна выходзіць і абвяшчае, што Кучма гатовы весьці перамову аб перадачы ўлады. Яна кажа таксама, што ў палацы знаходзяцца ўзброеныя асобы, у тым ліку расейцы, якія гатовы страляць у людзей. «Ён падмане! Сёнь-ня!» — скандуе вуліца Інстытуцкая.

Каля 22.00 даходзяць весткі пра надзвычайнае пасяджэньне ўраду. Усе чакаюць абвяшчэньня надзвычайнага становішча. Замест гэтага дзень сканчаецца зачытваньнем на УТ-1 заявы Кучмы пра тое, што сіла супраць мірных дэманстрантаў ня будзе ўжытая, і заклікае Юшчанку й Януковіча сесьці за стол перамоваў.

Кошт арэнды кватэраў на суткі ў Кіеве вырас у тры разы ў параўнаньні зь перадрэвалюцыйным пэрыядам.

Усю ноч на Майдане Незалежнасьці заставаліся людзі. Колькасьць намётаў вырасла да 1 600. Таксама ўсю ноч працягвалася аблога будынку Адміністрацыі прэзыдэнта. Уладам удаецца пасьпяхова блякаваць большасьць аўтадарог. Аднак у Кіеў працягваюць пратачвацца людзі з правінцыі. На дарозе з Валыні да Кіева стаіць калёна з 70 машын, дарога зь Львова на Кіеў заблякаваная.

## Пачынаецца з туалету

Мэр Кіева даручыў галоўнаму кіраўніцтву жыльлёва-камунальнай гаспадаркі гарадміністрацыі забясьпечыць устаноўку дадатковых сьметніц і кругласутачны вываз сьмецьця, а таксама ўстанавіць неабходную колькасьць прыбіральняў.

А 10-й раніцы аднавіўся мітынг у Кіеве, спачатку з удзелам усяго 50 тыс. чалавек. З Майдану камэндант намётавага гарадку выпраўляе групы дэманстрантаў, якія маюць заблякаваць важныя аб'екты ў горадзе. Першая група блякуе Ўкраінскі Дом, штаб-кватэру Расейскага клюбу — арганізацыі, створанай паслом Расеі В.Чарнамырдзіным для падтрымкі В.Януковіча. Людзі з Валынскай і Днепрапятроўскай абласьцей адпраўленыя блякаваць Цэнтрабанк Украіны, а з Кіеўскай замянілі тых, якія ўсю ноч блякавалі прэзыдэнцкі палац.

Кіеўскі мэтрапалітэн пачаў прапускаць людзей без жэтонаў. Людзі апускаюць грошы проста ў вялікія мэталічныя скрынкі на ўваходзе.

А 16-й пачаўся чарговы мітынг. Юшчанка зачытвае заяву М.Гарбачова: «Тое, што адбываецца ва Ўкраіне, — гэта сьведчаньне таго, што ўпала другая сьцяна». Сьпявачка Руслана абвяшчае галадоўку пратэсту.

Усе чакаюць абяцанага рашэньня Цэнтравыбаркаму. А 18.37 старшыня Цэнтравыбаркаму адэсіт Ківалаў абвяшчае Віктара Януковіча абраным прэзыдэнтам Украіны. Чатыры члены ЦВК з 15 адмаўляюцца падпісваць пратакол. Некаторыя журналісткі ў ЦВК плачуць.

Штаб Віктара Юшчанкі заявіў, што ўсе прававыя мэтады дзеяньня вычарпаныя, абвесьціў пра стварэньне Камітэту нацыянальнага ратунку і заклікаў да агульнанацыянальнага палітычнага страйку.

ЗША заявілі, што не прызнаюць вынікаў выбараў, абвешчаных Цэнтравыбаркамам. У сваю чаргу, прэзыдэнт Кучма зьвінавáціў апазыцыю ў ажыцьцяўленьні дзяржаўнага перавароту.

Ніхто не бярэцца прадказаць, чым скончыцца супрацьстаяньне ў Кіеве.

**Арцём Лява, Алесь Трафіменка.**
**Кіеў—Менск**

## Як прагаласавала Ўкраіна




Вынікі нацыянальнага экзыт-полу.




# Аранжавая рэвалюцыя

Барацьба колераў ёсьць адметнасьцю палітычнай сытуацыі на Ўкраіне. Тэлевізійныя кадры паказваюць плошчы, затопленыя аранжавымі сьцягамі, аранжавымі шалікамі, аранжавымі стужкамі. Расейскія назіральнікі абурaліся аранжавым колерам, які, маўляў, перашкаджаў галасаваць.

Калі аранжавы колер — гэта колер Юшчанкі, то кучмісты Януковіча абралі сабе іншыя фарбы: амаль незаўважныя на сьнезе, прыхаваныя й асьцярожныя сіня-белыя.

Узьдзеяньне гэтых колераў надзіва адпавядае палітычным схільнасьцям. Містыкі, псыхолягі дый паэты здаўна казалі, што аранжавы колер — гэта колер актыўнасьці, цяпла, напружаньня, а колер сіні — гэта пасіўнасьць, стабільнасьць і холад. «Сіні адпавядае вэртыкалі… Сіні ёсьць цемрай, якая сталася бачнай» — і нават так: «ідзе барацьба паміж жоўтым колерам і сінім».

Гэта ня вытрымкі з улётак — гэта са слоўніка сымбаляў. Сёньня аранжавы колер дамінуе на вуліцах Кіева. Студэнты «Пары» — руху супраціву, частуюць апэльсінамі замарожаных прыхільнікаў сіняга — Януковіча. Сетка парфумэрных крамаў «ВЦ» абвесьціла аб падтрымцы рэвалюцыі, упрыгожыўшы свае 74 магазіны «памаранчавымі балёнікамі» і дорачы купляньнікам мандарыны.

Аранжавая рэвалюцыя растапіла ўсходнеэўрапейскія прымаразкі — і колер гэты ўжо не забыць.

**Андрэй Расінскі**

# Вецер з поўдня

Віталь Сіліцкі

**Пуцін ператвараецца ў Мэтэрніха XXI ст., аднак спроба экспарту дыктатуры ва Ўкраіну правалілася.**



АРЦЁМ ЛЯВА

**«Можа камусьці не падабаецца мой твар? А гэта ж яго такім зрабіла ўлада. Добра яшчэ, што жывым застаўся. Мой твар — гэта твар Украіны». Віктар Юшчанка ў прамове перад прынясеньнем прэзыдэнцкае прысягі.**

Стаўка на ўкраінскіх выбарах — больш чым жыцьцё. Пытаньне ня толькі ў тым, які з двух кандыдытаў нарэшце стане прэзыдэнтам, нават ня ў тым, куды — на Ўсход ці Захад — паверне Ўкраіна. Сапраўдная стаўка — наколькі далёка на постсавецкай прасторы распаўзецца аўтарытарная зараза. Створыцца ці сканае новы «сьвятарны саюз» на пэрыфэрыі эўрапейскага кантынэнту, супраць дэмакратыі і свабоды. Расея, Беларусь, Казахстан… Як і ў 1991 г., не хапае толькі Ўкраіны. Як і тады, яе выбар вырашальны.

Адаб’ецца гэта хутка ці позна, можа нават і позна, але абавязкова на ўсіх. Без Украіны Расея не імпэрыя. Безь яе яна асуджана рухацца да эўрапейскай цывілізацыі. Гэтая максыма, выказаная даўным-даўно Зьбігневам Бжазінскім, сёньня яшчэ больш актуальная. Безумоўна, тым, хто стаіць на плошчах і майданах у Кіеве, Львове, Харкаве, Бжазінскі да аднаго месца. Яны проста хочуць бачыць сваю Бацькаўшчыну вольнай, без прэзыдэнта-зэка. Але рэчаіснасьць застаецца. Украіна — гэта лёс нашага рэгіёну.

Калі я пісаў гэтыя радкі, у Кіеве яшчэ нічога ня вырашылася. Можа, камандзе Кучмы-Медзьведчука пад псэўданімам Януковіч яшчэ і ўдасца захаваць уладу (што яны зь ёй цяпер будуць рабіць — гэта іншае пытаньне). Аднак адно ўжо зразумела: Украіна зрабіла велізарны крок у Эўропу. Не ў сэнсе геапалітыкі, а ў сэнсе таго, якую ролю ў яе жыцьці адыгрывае народ, супольнасьць грамадзянаў. Здаецца, усё было супраць гэтага. Пры 13-працэнтным росьце эканомікі ўрады звычайна не прайграюць нават справядлівыя выбары. Генэрал Мароз (не палітык, а прыродная зьява) цалкам на баку Януковіча і К°. Амаль поўная незацікаўленасьць і непрысутнасьць Эўропы. Здаецца, для іх менш дэмакратыі ва Ўкраіне — менш праблемаў з пашырэньнем ЭЗ. Злучаныя Штаты ледзь вылезьлі з уласнага выбарчага гармідару. Армія лабістаў Януковіча ў Вашынгтоне старанна апрацоўвала мясцовых палісымэйкераў. Таму ні ў Эўропе, ні ў Амэрыцы ніхто нічога не чакаў. Расея апалчылася, як на той

> Калі народ пераадольвае страх, баяцца пачынаюць усе астатнія.

«апошні і рашучы». Пуцін канчаткова сарваў маску, якую так старанна напяліў 11 верасьня 2001 г. і дзякуючы якой, а таксама высілкам некаторых нашых аналітыкаў, для якіх Масква — гэта дагэтуль пуп сусьвету, багата ў каго стварылася ілюзія, што ён — наш паратунак.

Адкрытае ўмяшальніцтва Пуціна ў прэзыдэнцкую кампанію суседняй дзяржавы — гэта ня толькі сьведчаньне таго, што расейскі імпэрыялізм яшчэ які жывы. Гэта спроба экспарту дыктатуры, пераносу расейскай мадэлі кіраваньня ўжо недэмакратыі на краіны, якія зь ёй хочуць разьвітацца.

Стваралася ўражаньне, што ў Маскве, Брусэлі і Вашынгтоне прэзыдэнта ўжо выбралі. Пуцін ператвараецца ў Мэтэрніха XXI ст., з маўклівага блаславеньня Захаду. Для Беларусі ягонае панаваньне ўжо дакладна нічога добрага не абяцае. Гэтая палітыка, аднак, можа збанкрутаваць на самым яе пачатку — дзякуючы ўкраінцам.

> Зьбігнеў Бжазінскі: «У выпадку паразы дэмакратыі ва Ўкраіне Пуцін адбудуе Савецкі Саюз».

У самой Украіне «фактар страху» дасягаў беларускага ўзроўню трохгадовай даўнасьці. Там, дзе не хапала міліцыі, на дапамогу рэкрутаваліся данецкія гопнікі. Данецкая вобласьць нават пераплюнула Беларусь па «дэмакратычнасьці» выбараў. Згодна са зьвесткамі Цэнтравыбаркаму, яўка тамака падчас другога туру сягала аж 102,3%. Як і мы, украінцы мелі поўнае права спужацца. І ўсё ж…

Усё ж выбухнула. Так, Украіна — не Беларусь. Некаторыя чыноўнікі там яшчэ не баяцца зьліваць інфармацыю. Адзін з такіх чайнікаў у атачэньні Януковіча ў дэталях расказаў карэспандэнту расейскага «Камерсанта» пра тое, як рабіліся фальсыфікацыі (вядома ж, не дзеля дапамогі Юшчанку, а з пачуцьця беспакаранасьці). Рэжым відавочна ня быў цалкам адмабілізаваны.

І на адміністрацыйны рэсурс там нельга да канца спадзявацца — у апазыцыі свайго хапае. Ва Ўкраіне, на дзьвюх трацінах яе тэрыторыі як мінімум, яшчэ існуе такая рэч, як выбары.

Галоўнае ж, як аказалася, урэшце ўсё вырашае сам народ. Ня выбарчыя камісіі і не адмінрэсурс. Не Масква і не Эўропа. Не спэцназ і не міліцыя. Калі народ сам пераадольвае страх, баяцца пачынаюць усе астатнія.

Аказваецца, поп-зоркі і спартоўцы таксама могуць набрацца мужнасьці выступіць за свабоду і дэмакратыю.

**Працяг на старонцы 11.**

ЛЕВЫМ ВОКАМ



# Украінская антыглябалісцкая рэвалюцыя

## Фэномэн Юшчанкі як рэакцыя дробнага буржуа на жахі буйнога капіталу

Калі вы сапраўды падтрымліваеце Юшчанку, ня вешайце на рукаве «памаранчаву стрычку», ня псуйце сьцяну знакам трызуба або слоганом «Так!». Пайдзіце ў найбліжэйшы камок і набудзьце цукеркі крамянчускай фабрыкі «Рашэль». Яе дырэктар Парашэнка — галоўны спонсар «Нашай Украіны» і 5-га тэлеканалу. Як, дарэчы, і кампанія Юліі Цімашэнкі, галоўны офіс якой знаходзіцца не ў нацыяналістычным Львове, а ў расейскамоўным Днепрапятроўску. Мала таго, падчас апошняй прыватызацыі «Крыварожсталі» Юшчанка прапанаваў прадаць былы флягман айчыннай мэталюргіі расейскаму бізнэсмэну Мардашову. Асноўны пафас юшчанаўскай крытыкі тэндэру, які досыць скандальна выйгралі «доны», — «Танна прадалі! Або прадаваць маскалям дорага, або ўвогуле не прадаваць». Нарэшце, Юшчанку сёньня настолькі патрэбны левы электарат, што апошнім часам ён, акрамя вершаў і тэкстаў Бібліі, пачаў цытаваць Леніна і, у адрозьненьне ад Януковіча, паабяцаў за тры месяцы вывесьці ўкраінскіх жаўнераў з Іраку.

Пагадзіцеся, гэтыя прыбамбасы слаба пасуюць тыражаванаму ў расейскіх СМІ міту: Юшчанка — бандэравец-заходнік, які ня можа заснуць, не забіўшы за дзень хаця б аднаго маскаля.

Прыхільнікі запаветаў Данцова, Міхноўскага і іншых зуброў украінскага нацыяналізму, як ні дзіўна, падчас кампаніі ў большасьці дзейнічалі ў ракурсе падтрымкі кандыдата ад улады. Выстаўляючыся яго «тэхнічнымі» супернікамі або распальваючы гістэрыю на тэму нацыяналізму, яны касілі капусту.

Мяркую, з 1990 г. Украіна не бачыла такога выбуху дзейнасьці ўльтраправых. Раман Казак штодня ў тэлеэфіры праянуковіцкіх тэлеканалаў даводзіў, што толькі зь Юшчанкам краіна здольная вызваліцца ад прыгнёту маскалёў. «Украінская нацыянальная асамблея» (УНА) Каваленкі праводзіла з дазволу ўраду маршы ў абарону «белай расы», камбінуючы лёзунгі «Нашай Украіны» і штурмавікоў СА. Тарас Чарнавіл, сын таго самага Чарнавіла, падтрымліваў Януковіча. Ларыса Скорык, вядомая ў 90-я як нацыяналістычны вамп, даводзіла, што ніхто Юшчанкі не атручваў. Група «Сокалы» на чале з Мацялкам — выканаўцам бандэраўскіх хітоў — агітавала супраць «камунякі Юшчанкі». Я ўжо не кажу пра «Брацтва» Карчынскага. Затое, каб сваім паказным экстрэмізмам адцягнуць моладзь ад «Пары», былы фюрэр УНА-УНСО, як сам недзе хваліўся, атрымаў 6 мільёнаў зялёных.

А што яшчэ было рабіць? Нацыяналісты з пачатку 90-х знаходзяцца ў крызісе: падтрымаўшы посткамуністычную намэнклятуру, якой нацыянальная фразэалёгія была патрэбна для легітымацыі ўлады, яны сталі закладнікамі ўсіх яе эканамічных правалаў. Фіяска на выбарах 1998 г. «Нацыянальнага фронту» (кааліцыі правых нацыяналістаў) прадэманстравала: як самастойная сіла «самастойнікі» не існуюць і павінны выступаць або ў блёку зь іншымі палітычнымі сіламі (так зрабіў Андрэй Шкіль, перайшоўшы з УНА—УНСО ў «Нашу Ўкраіну»), або… прадавацца.

**Працяг на старонцы 16.**

# Беларускі дэсант

## «Калі зьдзяйсьняецца рэвалюцыя, гэта не замінае астатнім піць каву»

**Многія з тых, хто набываў на гэтым тыдні квіток да Кіеву, мелі ў багажы ня толькі цёплыя пальчаткі, запасныя шкарпэткі ды пігулкі ад прастуды, але й бел-чырвона-белыя сьцягі. «Хартыя'97» ацэньвае колькасьць беларускіх актывістаў у Кіеве ў паўтысячы. Назіральнікі, што вярталіся з выбараў праз украінскую сталіцу, кажуць пра сто чалавек. Прысутнасьць беларусаў на Майдане відавочная — нашыя сьцягі мільгаюць на тэлеэкранах ці не часьцей за ўкраінскія. Кастусь і Аляксей, сябры Маладога Фронту зь Віцебску, якія папрасілі не падаваць іх прозьвішчаў у газэце, распавялі «НН» пра свой удзел у Кіеўскіх падзеях.**



АРЦЁМ ЛЯВА

Мы прыехалі ў Кіеў суботнім ранкам. Агулам сабралася чалавек 70 беларусаў, ня толькі хлопцы, але й дзяўчаты. Хлопцы-украінцы зладзілі намёты, добры такі лягер выйшаў. Яны, праўда, разьлічвалі, што беларусаў прыедзе чалавек сто. Як паднялі сьцягі, да нас пачалі падыходзіць людзі, пытацца, адкуль мы. Казалі: «Дзякуй, беларусы, што нас падтрымліваеце». У гэтым жа лягеры былі грузіны з Аджарыі, ад арганізацыі «Кхмара». Абяцалі: «Мы перамаглі ў сябе, дапаможам Украіне, а потым да вас прыедзем». У нядзелю, калі «Пара» зладзіла невялікі рок-канцэрт на Кантрактовай плошчы, мы стаялі ў ахове, хоць у нас арганізацыі не было ніякай. Па арганізацыі беларусаў будзем разьбірацца тут, бо там сябе саміх ганьбіць не хацелася.

### На Майдане

А дзявятай вечара ў нядзелю мы рушылі на Майдан Незалежнасьці. Мы ідзём, машыны сыгналяць. Але ж і фінансава, ядома, Юшчанку падтрымалі — во-о-ой, гэта трэба бачыць. Увесь горад у постэрах, расьцяжкі зь Юшчанкам на плошчы. Усе машыны езьдзяць са стужкамі ці з плякатамі «За Юшчанку», такія ж стужкі ды сьцяжкі ў кожнага.

На Майдане з палявой кухні давалі гарачую ваду, каб можна было зрабіць распушчальную каву. Былі й бутэрброды. Дзесьці а палове на першую кажуць: усё, разыходзьцеся, хлопцы, мы вас чакаем а дзявятай ранку. Як нам здаецца, яны разьлічваюць на грузінскі варыянт: падлік галасоў зацягнецца, пад'едуць людзі з Заходняй Украіны, будуць у намётах жыць, а калі яны афіцыйныя вынікі атрымаюць, тады ўвесь Кіеў выйдзе ды рушыць на Выбаркам. Да гэтага — так нас адразу папярэджвалі на мітынгу — ніякага гвалту, трэба сяліцца ў намётах ды чакаць.

### Свабода ды агітацыя

Уразіў высокі ўзровень свабоды. Колькасьць міліцыянтаў на вуліцах была ў дзясяткі разоў меншая, чым сёньня ў Менску. У дзень выбараў, праўда, панавезьлі міліцыянтаў у двары, але на вуліцах былі толькі адзінкі. Аніякай агітацыі за Януковіча мы ў Кіеве не заўважылі. Абышлі бадай увесь горад, але ўбачылі толькі адну парваную ўлётку ў сьметніцы. Не было й абяцаных Януковічам шахцёраў — іх бы адразу выкінулі з Кіева. А па апазыцыйным Пятым канале паказвалі тэлемарафон ды ладзілі жывыя масты зь Львовам.

Украінскіх сьцягоў не было відаць, бо яны свой сьцяг не хацелі палітызаваць. Затое ўвесь Кіеў быў аранжавы. На машынах, на таксі, на чым хочаш. Адна кампанія зь Беларусі намерзлася ды паехала ў саўну, дык таксіст зь імі сам пачаў размаўляць, пытацца: «Вы за Юшчанку?» Калі мы перасякалі мяжу ў Чарнігаве, вяртаючыся назад, выявілася, што хлопец згубіў міграцыйную картку. Калі мытнікі даведаліся, што мы прыяжджалі падтрымаць Юшчанку, гэтую праблему адразу вырашылі. Але — чаго ўжо там хаваць — будзем шчырымі: як пераехалі мяжу, бел-чырвона-белыя сьцягі мы пазгортвалі.

Настрой у людзей добры, яны будуць стаяць да перамогі. Але ці пойдуць яны не здабываць? Людзі ўсе аднолькавыя, як і ў нас. Тыя, хто папрыяжджалі з рэгіёнаў, заходнікі, будуць трымацца, ну а кіеўцы… Яны, вядома, будуць падтрымліваць, прыйдуць, калі паклічуць, на акцыі. Аднак калі зьдзяйсьняецца рэвалюцыя, гэта не замінае астатнім дзесьці сядзець ды піць каву. Так і там. Кіеў настроены радыкальна, але такі настрой трэба падтрымліваць. Пасьля выступу Юшчанкі, калі ён сказаў, што будзе вырашаць, як зьбіраць Раду, народ патроху пачаў разыходзіцца, бо панядзелак — ужо трэба працаваць людзям. Цімашэнка заклікала да страйку, аднак не было відаць, каб кіеўскія кавярні пазачыняліся.

### Сцэна

Была такая трыбуна, такая сцэна! Трэба было б, каб кіраўнік якой-небудзь з нашых партый прыехаў у Кіеў, пажыў у гатэлі «Ўкраіна», выступіў. Няхай гэта будзе Лябедзька, няхай сябар Нямцова, але каб быў прыстойна апрануты чалавек у якім-небудзь касьцюме ад «Х'юга Бос», каб прыемна было паглядзець, які выйдзе ды скажа, што ёсьць беларусы. А так — навідавоку толькі Сяргей Высоцкі быў, гуртаваў людзей больш-менш.

**Алесь Кудрыцкі**

ЯК ФАЛЬШАВАЛІ

# 1000 даляраў для беларускай назіральніцы

**Шмат беларусаў сачылі за ходою выбараў у якасьці назіральнікаў. Назіральнікі з нашай краіны да афіцыйных вынікаў ставяцца скептычна. Эўрапейская сетка па назіраньнях за выбарамі ENEMO накіравала 110 беларусаў у самы цяжкі рэгіён — усходні «чырвоны пас», дзе ўвесь адміністрацыйны рэсурс быў кінуты на забесьпячэньне максымальнай яўкі, што гарантавала перавагу Януковіча.**

Калі ў Беларусі асноўнае фальшаваньне адбываецца ў часе датэрміновага галасаваньня, дык ва Ўкраіне — у часе галасаваньня па «адмацавальных талёнах». Па ўсім усходзе былі сфармаваныя мабільныя брыгады з прыхільнікаў Януковіча, кожны зь якіх меў па 5—7 адмацавальных талёнаў і па некалькі разоў галасаваў на розных участках. Назіральнікі ахрысьцілі гэтую сыстэму «карусэль». Беларускія назіральнікі бачылі пад Данецкам, у Валадарскім раёне, як між участкамі курсавалі аўтобусы з усё тымі самымі «выбарцамі».

Украінскае выбарчае заканадаўства досыць лібэральнае. Назіральнікам дазваляецца сачыць за падлікам галасоў, які мае права зьдзяйсьняць толькі адзін сябра камісіі. Ён павінен уголас зачытваць, за каго пададзены бюлетэнь ды дэманстраваць яго назіральнікам, а тыя маюць права ў любы момант прыпыніць працэдуру. Але на многіх участках гэткай ідыліі й блізка не было.

Назіральнікаў усяляк спакушалі: участковыя камісіі атрымалі дадатковыя рэсурсы для банкетаў. Адразу пасьля прыезду беларусаў мясцовая вэртыкаль пачынала распавядаць пра векавую дружбу, запрашаць падсілкавацца. Былі й спробы падкупіць грашыма, харчамі ды нават «адпачынкам зь дзяўчатамі на Азоўскім моры».

Асабліва абуральным быў выпадак з Тацьцянай Равякай. На яе ўчастку адключылі сьвятло і камісія лічыла бюлетэні ў сьвятле Тацьцянінага ліхтарыка, умантаванага ў мабільны тэлефон. Пасьля заканчэньня падліку яна атрымала копію выніковага пратаколу ды паехала ў тэрытарыяльную выбарчую камісію, дзе былі агучаны канчатковыя вынікі. Тацьцяна абурылася, калі пачула завышаныя лічбы яўкі ды галасаваньня за Януковіча па яе ўчастку. Старшынька камісіі, даведаўшыся, што ў Тацьцяны ёсьць копія пратаколу з рэальнымі лічбамі, пачала ўгаворваць назіральніцу аддаць пратакол. Атрымаўшы адмову, прапанавала 1000 даляраў. Тацьцяна адмовілася.

На многіх участках прысутнічалі падазроныя тыпы ў скуранках, якія чынілі ціск на назіральнікаў ад Юшчанкі, ды сачылі за замежнымі назіральнікамі. На ўчастку, дзе працаваў Уладзь Лабковіч, прысутнічалі назіральнікі ад Юшчанкі з Івана-Франкоўску. Калі яны прыехалі да ўчастку, на іх кінулася пяць чалавек у скуранках ды пачалі зацягваць у машыну. Замежным назіральнікам давялося літаральна адбіваць дзяўчат. Пасьля галасаваньня прыехалі хлопцы з Івана-Франкоўску ды зноў ледзьве ня з бойкай забралі назіральніц. За іх машынай адразу ірванула аўто з «скуранкамі». «Чым гэта скончылася, невядома», — кажа Лабковіч.

Мясцовыя назіральнікі ад Юшчанкі трымаліся ціха ды нярэдка абіралі за лепшае не пратэставаць супраць парушэньняў: дзе-нідзе ўчасткі «ахоўвалі» казакі з шашкамі.

**АК**

### Рэха рэвалюцыі ў менскіх тэатрах

**Удзельнікі мужчынскай капэлі «Men Sound», якія выступалі перад менчукамі падчас Дзён украінскай культуры ў Тэатры эстрады ў сераду, падкрэсьлілі, што да сваіх строяў яны дадалі памаранчавыя стужкі ў знак падтрымкі Юшчанкі. Публіка адказала авацыяй.**

**А група акцёраў Тэатру імя Івана Франка адмовілася граць у Менску прызначаны на 27 лістапада спэктакль «Швэйк». Нагода — віншаваньні Лукашэнкі Януковічу. Трупа тэатру афіцыйна падтрымала дэманстрантаў Юшчанкі.**

**А ў пасольстве Ўкраіны ад камэнтароў ухіляюцца: «абстаноўка ў нас працоўная. Мы займаемся Днямі культуры Ўкраіны ў Беларусі».**

# Сьвецкіх зьвяроў не бывае

## Найлепшы беларускі тэнісіст Макс Мірны падае ў сусьветным рэйтынгу



Андрэй Лянкевіч

Вось і завяршыўся тэнісны сэзон-2004. Мужчынам засталося толькі вызначыць уладальніка Кубку Дэвіса: 3—5 сьнежня ў Сэвільі ў фінале згуляюць зборная Гішпаніі ды крыўдзіцелі беларусаў па 1/2 фіналу амэрыканцы. Сьнежань — месяц адпачынку. Тэнісісты ўступаюць у бой адразу па Новым годзе: 3 студзеня турнірамі ў Адэлаідзе (Паўднёвая Аўстралія) і Катары распачнецца новы сэзон, а 17 студзеня на кортах Мэльбурну стартуе першы турнір Вялікага шлему — Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі.

На мінулым тыдні ў Х’юстане дуэт Максіма Мірнага і Махеша Бхупаці (Індыя) у складзе васьмі наймацнейшых пар сьвету браў удзел у выніковым турніры сэрыі ATP «Masters Cup». Як і летась, беларус спыніўся за крок ад паўфіналу. Беларуска-індыйскі дуэт прайграў у падгрупе вырашальны матч братам-блізьнятам Бобу і Майку Браянам. Дарэчы тая гульня двойчы пераносілася з прычыны моцных дажджоў у Тэхасе.

Калі ня браць пад увагу пасьпяховы выступ у Кубку Дэвіса, сэзон для Мірнага склаўся няўдала. Па выніках 2003 г. у чэмпіёнскай гонцы Асацыяцыі тэнісістаў-прафэсіяналаў (ATP) ён займаў 23-е месца, у індывідуальным рэйтынгу парных тэнісістаў быў першым. А ў жніўні 2003 г. наагул паказаў свой найлепшы вынік у індывідуальным разрадзе — падняўся на 18-е месца. Тыя дасягненьні — у мінулым.

Сёлета відавочны рэгрэс. Паводле выніковага рэйтынгу за 2004 г. ATP, распаўсюджанага ў гэты панядзелак, Мірны апусьціўся на 10-ы радок у індывідуальным рэйтынгу найлепшых парных тэнісістаў. У чэмпіёнскай гонцы ATP-2004 беларус на 42-м месцы.

У індывідуальным разрадзе Макс даходзіў толькі да паўфіналу ў Ратэрдаме ды чвэрцьфіналу ў Марсэлі. А ў большасьці турніраў вылятаў на першым ці другім этапах. Як вынік, на прэстыжных турнірах у індывідуальным разрадзе Макса часьцей сталі адпраўляць у кваліфікацыю. Выпаўзеш з кваліфікацыі, а тут табе арганізатары на першым этапе «падсоўваюць» першы ці другі нумар на турніры. Таму беларус так хутка і зачахляе ракетку.

У парным разрадзе таксама справы ідуць ня лепшым чынам. Мірны разам з Бхупаці выйграў толькі адзін тытул — турнір сэрыі «Мастэрз» у Рыме. Аднойчы Макс — разам са швэдам Ёнасам Б’ёркманам — дайшоў да фіналу парнага разраду (Канада) і восем разоў з рознымі напарнікамі да паўфіналаў. Тыя ж браты Браяны сёлета заваявалі шэсьць тытулаў, у тым ліку перамаглі на турніры ў Х’юстане. Столькі ж тытулаў і на рахунку наймацнейшай на сёньня пары сьвету Марка Ноўлза (Багамы) і Дэніэла Нэстара (Канада).

Магчыма, на спартовых дасягненьнях тэнісіста, якому спартовыя журналісты далі мянушку «Зьвер», адмоўна адбілася актыўнае сьвецкае жыцьцё. Таксама мала каму ўдаецца сумяшчаць пасьпяховую гульню ў парным і індывідуальным разрадах. Наймацнейшы на сёньня тэнісіст Ражэ Фэдэрэр (Швайцарыя) калісьці таксама спрабаваў гуляць і ў пары (прычым пасьпяхова гуляў у дуэце зь Мірным), і ў індывідуальным разрадзе. Агледзеўся, што цяжкавата, і сканцэнтраваўся на індывідуальным. Напрыклад, у 2004 г. швайцарац выйграў 11 турніраў і забясьпечыў сабе перамогу ў чэмпіёнскай гонцы ATP датэрмінова, яшчэ ў верасьні.

Магчыма, наступны год будзе больш удалым для Максіма Мірнага. Беларусаў чакае матч 1/8 фіналу Кубку Дэвіса са зборнай Румыніі. Калі пераможам, хутчэй за ўсё, у чвэрцьфінале ў Менску сустрэнемся са зборнай ЗША. Якая гістэрыя разгорнецца вакол гэтага матчу! Апалітычным амэрыканскім тэнісістам прыпомняць усё: і Акт аб дэмакратыі ў Беларусі, і рэзалюцыю па правах чалавека, і шмат чаго іншага, што пасьпее прыняць да вясны Кангрэс ЗША. Беларускае кіраўніцтва і тэлебачаньне зробяць усё мажлівае, кабператварыць спартовы двубой у палітычнае шоў. А са спартовага гледзішча будуць усе шанцы ўзяць рэванш за паразу ў паўфінале ў Чарлстане. На менскім корце Родзік і Агасі ня страшныя. Як пажартаваў адзін з наведнікаў спартовых сайтаў, больш хуткаснае за сталічны корт пакрыцьцё — толькі на аўтастрадзе Менск—Дразды.

**Алег Раявец**

НАВІНЫ СПОРТУ

### Пабілі саюзьнікаў

22 лістапада нацыянальная футбольная зборная ў Абу-Дабі на стадыёне «Аль-Джазыра» згуляла таварыскі матч са зборнай Аб’яднаных Арабскіх Эміратаў. Беларусы паляцелі ў ААЭ з экспэрымэнтальным складам. З той прычыны, што матч быў пастаўлены па-за календаром ФІФА (на выходных праходзілі матчы нацыянальных чэмпіянатаў, а ў аўторак—чацьвер — Лігі чэмпіёнаў), многія клюбы не адпусьцілі футбалістаў. Усё ж беларусы атрымалі валявую перамогу — 3:2. Трапныя стрэлы на рахунку Алега Шкабары, Леаніда Ковеля, Аляксандра Кульчыя. Дарэчы, да апошняга моманту было невядома, ці адбудзецца матч. Трэцяга лістапада памёр прэзыдэнт краіны Заід бэн Султан аль-Нахаян, і ў ААЭ абвясьцілі саракадзённую жалобу з адменай усялякіх забаўляльных мерапрыемстваў.

### Посьпех Крыкунова

Працягвае граміць усіх у расейскай хакейнай супэрлізе маскоўскае «Дынама». У панядзелак пад гэты каток трапіў пермскі «Молат» — 5:0. Адрыў сталічнага клюбу ад канкурэнтаў склаў 10 балаў. «Дынама» ўзначальвае экс-трэнэр зборнай Беларусі Ўладзімер Крыкуноў.

### Дыскваліфікавалі за шклянку напою

Гульца «Індыяны Пэйсэрс» Рона Артэста Нацыянальная баскетбольная асацыяцыя дыскваліфікавала да канца сэзону. Ён быў ініцыятарам бойкі падчас гасьцявога матчу з «Дэтройтам Пістанс». За 46 сэкундаў да канца матчу пачалася патасоўка Артэста з баскетбалістам «Дэтройту» Бэнам Уолесам. А потым заўзятар «Дэтройту» з трыбунаў шпурнуў у Артэста плястыкавым стаканам з напоем, і «індыянец» па крэслах, расьпіхваючы гледачоў, палез ставіць крыўдзіцеля на месца. За гледача заступіліся абаронца мічыганскага клюбу Стывэн Джэксан і іншыя заўзятары. За Артэста грудзьмі стала ўся «Індыяна»… У выніку матч так і ня быў дагуляны, а судзьдзі дыскваліфікавалі ажно дзевяць баскетбалістаў — чатыры з «Індыяны» і пяць з «Дэтройту».

…Каб нам крыху такога экшэну на матчах унутранага баскетбольнага чэмпіянату!

### БФФ — 15 гадоў

21 лістапада Асацыяцыя «Беларуская фэдэрацыя футболу» адзначыла 15-годзьдзе. Першым старшынём у свой час быў заслужаны трэнэр БССР Яўген Шунтаў. У склад выканкаму тады ўвайшоў, сярод іншых, Генадзь Карпенка.

**АР**

НА ПРАВОХ РЭКЛЯМЫ

## Эўразьвязаўская падтрымка для малых і сярэдніх прадпрыемстваў

Пытаньне занятасьці зьяўляецца адным з найважнейшых у Эўразьвязе. Эўрапарлямэнт робіць шмат захадаў, каб абмежаваць беспрацоўе і спрыяць разьвіцьцю прафэсійнай актыўнасьці грамадзян. Існуе Эўрапейская стратэгія занятасьці, якая вызначае задачы, якіх трэба дасягнуць у гэтай галіне. Вызначаная мэта: да 2010 г. у Эўразьвязе мусіць быць дасягнута поўная занятасьць — 70% працаздольных мужчын і 60% працаздольных жанчын будуць працаваць. Адным з мэтадаў барацьбы зь беспрацоўем зьяўляецца падтрымка малых прыватных фірмаў.

Прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Квасьнеўскі заявіў на XXXI Сусьветным кангрэсе малога бізнэсу, які прайшоў у Варшаве: «Малы й сярэдні бізнэс — гэта дрожджы эканомікі. Вы належыце да найбольш гнуткіх фірмаў, здольных хутка прыстасоўвацца да вымог рынку. Менавіта вы й вашы фірмы найбліжэй да звычайнага грамадзяніна. Вы даяце прыклад, як дасягаць посьпеху ў жыцьці, як быць актыўным і самастойным».

Для барацьбы зь беспрацоўем і разьвіцьця малога прыватнага бізнэсу Эўразьвяз выдзяляе немалыя фінансавыя сродкі, значная частка якіх трапляе ў Польшчу. Разьмеркаваньнем дапамогі займаецца польскае Агенцтва разьвіцьця прадпрымальніцтва. Датацыі можна атрымаць на самыя розныя дзеяньні, агульная мэта якіх — разьвіцьцё ўласнага прадпрыемства. Прадпрымальнікі могуць атрымаць бясплатную інфармацыю й дапамогу па здабыцьці сродкаў у няўрадавых арганізацыях.

На Беласточчыне па бясплатную кансультацыю можна зьвярнуцца ў гайнаўскі Цэнтар падтрымкі бізнэсу. Гэта адзін з офісаў падляскага Фонду рэгіянальнага разьвіцьця. Наш суразмоўца — **Тамаш Сахарчук**, дарадчык Цэнтру падтрымкі бізнэсу.

**— Якую дапамогу могуць знайсьці прадпрымальнікі ў вашым цэнтры?**

— Той, хто зьвернецца ў Цэнтар падтрымкі бізнэсу, можа атрымаць цэлы пакет інфармацыі — пра памер фінансавай дапамогі, дзе можна атрымаць бланкі і як іх запоўніць, якія дадатковыя дакумэнты прыкласьці, куды гэтыя заявы аднесьці і на што можна атрымаць фінансавую дапамогу.

**— Якую суму грошай можа атрымаць з эўразьвязаўскіх фондаў кожны прадпрымальнік?**

— У праграме «Phare-2002», рэалізацыя якой працягваецца, прадпрымальнікі маглі атрымаць датацыю ад 2 да 50 тыс. эўра. Прадпрымальнік найперш выдаткоўвае свае грошы, а потым атрымлівае кампэнсацыю патрачаных сродкаў.

**— А калі прадпрымальнік можа пачынаць рабіць выдаткі? Ці няма такой пагрозы, што ён выдаткуе сродкі і не атрымае датацыі?**

— Усе пададзеныя заявы праходзяць ацэнку рэгіянальнай фінансуючай установы ў Беластоку, потым прадпрымальнік атрымлівае інфармацыю, ці прымаецца ягоная заява. Калі так, яго запрашаюць падпісаць дамову аб датацыі і з гэтага моманту ён можа распачаць інвэстыцыйныя дзеяньні, зьвязаныя з дадзенай праграмай.

**— Ці ахвотна мясцовыя бізнэсоўцы карыстаюцца датацыямі Эўразьвязу?**

— Зацікаўленьне праграмай «Phare-2002» было вельмі вялікае. Праграма складалася зь некалькіх разьдзелаў. Апрача датацый выключна інвэстыцыйных, ёсьць таксама датацыі на дарадчыя паслугі.

Аднак найбольш папулярным быў рэгіянальны Фонд інвэстыцыйных датацый, дзе можна было атрымаць сродкі на новыя машыны, станкі, на пакупку новых прылад працы, транспартных сродкаў.

Эўразьвязаўскія праграмы фінансаваньня пачалі зьяўляцца з 2000 г. і ўвесь час адкрываюцца новыя. Аднак Эўразьвяз пільна правярае трату кожнага эўра. Таму, каб атрымаць датацыю, прадпрымальніку трэба дакладна выканаць усе вызначаныя ўмовы. Гэта пацьвярджае адзін з уладальнікаў беластоцкай фірмы «Gaja»:

— Мы працаўладкоўваем дарадчыкаў, якія дапамагаюць пісаць такія праекты. Яны вельмі складаныя. Шмат патрабаваньняў, якіх трэба строга прытрымлівацца, бо ад гэтага залежыць ацэнка донарскай установы.

Кравецкая фірма зь Беластоку скарысталася датацыяй Эўразьвязу.

**— Ці для вашага прадпрыемства гэта была значная дапамога?**

— У маштабе нашага прадпрыемства яна не была вялікай. Але кожная дапамога патрэбная, і трэба ёй карыстацца.

**Паводле радыё «Палёнія»**

http://www.radio.com.pl/polonia

# Банкір з замашкамі лінгвіста

**Швайцарац Поль Зутэр дасьледаваў тэфсыр — сярэднявечны пераклад Кур'ану на беларускую мову.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Швайцарскі дасьледнік Паўль Зутэр на прэзэнтацыю сваёй кнігі «Alfurkan Tatarski» ў гатэль «Кастрычніцкі» спазьніўся. У фае перад канфэрэнц-заляй нэрвова перашэптваліся прадстаўнікі творчага бамонду — выдавец Зьміцер Санько, лацініст Алесь Жлутка, мовазнаўца Генадзь Цыхун. Усе салідныя, у пінжаках, пры гальштуках. А Зутэр прыйшоў зусім адрозны: шумны, у кашулі, з заплечнікам і з пакетам у руках.

Ён лінгвіст з адукацыі, але зусім ня «кніжны чарвяк» — цяпер працуе ў банку. Пачынаў з арабістыкі. Вывучаў арабскую мову, іслам у акадэмічных аўдыторыях Эўропы і беспасярэдне на Ўсходзе. На пачатку 80-х зацікавіўся славянскімі тэкстамі, запісанымі арабскімі літарамі: гэткім спосабам запісу карысталіся на Балканах. Тое, што гэтак пісалі й беларускія татары, сталася для Зутэра адкрыцьцём. Праз Моніку Банькоўскую й Арнольда Макміліна ён здабыў копію рукапісу тэфсыру (пераклад Кур'ану з камэнтарамі), якая захоўваецца ў Скарынаўскай бібліятэцы ў Лёндане. На пачатку 90-х заняўся дасьледаваньнем тэксту. «Калі я пачынаў працу, я ня ведаў, што мяне чакае. Каб ведаў, гэтая кніга наўрад ці пабачыла б сьвет», — прызнаўся Зутэр. Паводле прызнаньня дасьледніка, найбольш складаным для яго было вызначыць мову тэксту: «Адзін дзень я чытаў урывак — і бачыў, што ён напісаны па-польску. Другі дзень я чытаў той самы ўрывак — і бачыў, што ён беларускі».

У тэфсыры беларускіх татараў Зутэр бачыць вялізнае значэньне для агульнаэўрапейскай культуры: «У 1643 г. рэфарматар зь Цюрыху, якога называюць Бібліяндэр, выдаў першы ў Эўропе друкаваны пераклад Кур'ану, але ён карыстаўся кепскім лацінскім перакладам. І на той друкаваны пераклад спасылаліся ўсе пры рэлігійнай палеміцы — нават тут, на гэтых землях. У вас тут ня ведалі, што зусім блізка больш правільны пераклад Кур'ану».

Асобна зайшла на прэзэнтацыі гаворка пра гельвэтыка-беларускія повязі. Зутэр прызнаўся, што быў зьдзіўлены, калі даведаўся, якая велізарная колькасьць швайцарскіх пратэстантаў у свой час у пошуках краіны рэлігійнае талерантнасьці пераехала на жыцьцё ў Вялікае Княства Літоўскае. Адам Мальдзіс, у свой чарод, згадаў ураджэнцаў Беларусі, якія жылі ў Швайцарыі: Касьцюшка, Міцкевіч, слынная мэцэнатка княгіня Магдалена Радзівіл. Сярод тых, хто й цяпер жыве ў Швайцарыі, Мальдзіс назваў княгіню Караліну Чацьвярцінскую, а таксама нашчадка Лазара Богшы — генэральнага дырэктара міжнароднай асацыяцыі інтэлектуалаў Арпата Богшу. Прапанова правесьці круглы стол па праблеме беларуска-швайцарскіх повязяў спадабалася ўсім.

**Адам Воршыч**

**Рэцэнзію Сяргея Богдана на «Альфуркан Татарскі» чытайце ў новым нумары «ARCHE».**

КАЛЯНДАР

## Сьнежань

375 гадоў з дня нараджэньня **Сімяона Полацкага** (сапр. Самуіл Пятроўскі-Сітняновіч; 1629—1680), беларускага й расейскага паэта, драматурга, перакладніка, асьветніка.

200 гадоў з дня нараджэньня **Юзафа Азямблоўскага** (каля 1804 — 1878), графіка.

175 год з дня нараджэньня **Людвіка Зьвяждоўскага** (1829, Вільня — 1864), аднаго з кіраўнікоў паўстаньня 1863—1864 г.

150 гадоў з дня нараджэньня **Тэрэзы Гардзялкоўскай** (псэўд. Зязюля; 1854—1933), перакладчыцы, выдаўца.

100 гадоў з дня нараджэньня **Мікалая Васілеўскага** (1904—1937), графіка, жывапісца.

100 гадоў з часу заснаваньня (1904) **Віленскага мастацка-прамысловага таварыства**, культурна-асьветнай арганізацыі ў Вільні. Існавала да 1915 г.

100 гадоў з дня нараджэньня **Францішка Грышкевіча** (1904 ці 1906 — 1944 ці 1945), беларускага пісьменьніка, дырэктара Віленскай беларускай гімназіі.

100 гадоў з дня нараджэньня **Рамана Семашкевіча** (1904—1937), жывапісца, графіка, скульптара.

100 гадоў з дня нараджэньня **Паўлюка Шукайлы** (1904—1939), паэта, празаіка, крытыка.

75 гадоў з часу стварэньня **Інстытуту мовазнаўства** імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1929).

75 гадоў з часу заснаваньня **Польскага дзяржаўнага вандроўнага тэатру БССР** (1929). Існаваў да 1936 г.

6 — 175 год з дня нараджэньня **Мікалоюса Акялайціса (Акялевіча)** (1829—1887), літоўскага асьветніка, які распрацаваў плян выданьня кніг для беларусаў і літоўцаў на іх родных мовах.

9 — 250 год з дня нараджэньня **Юзафа Канстанціна Багуслоўскага** (Багуслаўскага) (1754, Берасьцейшчына — 1819), багаслова й калекцыянэра.

24 — 100 год з дня нараджэньня **Алеся Дудара** (сапр. Аляксандар Дайлідовіч; 1904, Петрыкаўскі раён — 1937), паэта, аднаго з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднаньня «Маладняк».

25 — 100 год з дня нараджэньня **Іосіфа Гусакоўскага** (1904, Крычаўскі раён — 1995), генэрала, двойчы Героя Савецкага Саюзу (1944, 1945 г.).

27 — 25 год з часу ўвядзеньня савецкіх войскаў у Аўганістан (1979—1989).

29 — 75 год з дня нараджэньня **Аркадзя Іванова** (1929), оптыка, чальца-карэспандэнта НАН Беларусі.

30 — 100 год з дня нараджэньня **Зэліка Аксельрода** (1904, Маладэчна — 1941), жыдоўскага паэта.

31 — 125 год з дня нараджэньня **Іосіфа Уншліхта** (1879—1938), савецкага партыйнага й ваеннага дзеяча, які ваяваў у Беларусі з палякамі.

31 — 100 год з дня нараджэньня **Івана Варвашэні** (1904, Капыльскі раён — 1957), аднаго з кіраўнікоў камуністычнага падполья ў Менскай вобласьці ў часе Другой сусьветнай вайны.

# Цяжкая цешча Манамаха

«Легенда пра лэдзі Гадзіву». Мультфільм. «Беларусьфільм». Рэж. Ірына Кадзюкова.

Сьнег яшчэ ня валіць, але ўжо вецер са стэпу і недзе далёка на Ўсходзе (а можа, і яшчэ далей — у самым Уручы) магі наўючваюць вярблюдаў золатам, сьмірнай і ладанам. І самы час распачаць калядны сэзон. Таму 16 лістапада я ўсё кінула і пайшла ў «Перамогу» на прэм'еру «Легенды пра лэдзі Гадзіву». Гэты мульцік — апошні з цыклу «Калядныя гісторыі» («Сьвяточные рассказы»), які ствараўся на працягу 10 год і ў які ўвайшлі 10 фільмаў.

Цудоўная анімацыя, цудоўныя дэталі (цудоўны сабачка скача пад музыку вандроўных музыкаў), цудоўная бард Лена Фралова з цудоўнай «Анёльскай песенькай» Бродзкага. Але я ніяк не магла зразумець, чаму аўтарка мяшае два стылі — суворае ангельскае сярэднявечча і старажытнарускі Бізант-стайл. Рыцары скачуць князязгараўскія, у пэрсанажаў — «ня твары, а лікі»… Лэдзі Гадзіва ў сваім Ковэнтры вянчаецца, а над ёй ледзь не анёлы Фэафана Грэка лунаюць… У выніку выглядала «Лэдзі Гадзіва» культурным кентаўрам. Пасьля нам растлумачылі, што ўнучка Гадзівы стала жонкаю Ўладзімера Манамаха. Але ад гэтай інфы нічога на свае месцы ня стала, толькі яшчэ ніякавацей зрабілася.

Для мяне гэта быў адзін з момантаў, калі пачынаеш прыслухоўвацца да перасьцярог мудрых сівых сумленьняў нацыі пра «нашы хаатычныя часы постмадэрнізму і эклектыкі». Яшчэ сумленьні любяць казаць пра бездухоўнасьць, але чаго-чаго, а духоўнасьці ў караценькай «Лэдзі Гадзіве» было аж зашмат. Аж у дзьвюх вэрсіях — лацінкаю і кірыліцай, так бы мовіць.

Затое іншыя мульцікі з цыклу «Калядныя гісторыі», паказаныя ў той жа вечар, зьнятыя раней, да 2000 году н.э. (мілая мініяцюра па матывах вершу Сашы Чорнага, «Дзяўчынка і запалкі» паводле Андэрсэна і сучасная гарадзкая казка пра катоў, якія сьвяткуюць Раство на сьметніку), былі белымі, пухнатымі і вельмі сагрэлі. Шкада, рэжысэрка зьмяніла свае погляды на анімацыю. Ня ведаю як наконт духоўнай, але што раней у яе душэўней выходзіла — дык гэта дакладна.

**Марыйка Мартысевіч**

ДЫСКАГРАФІЯ

## Беларускі дыксылэнд




(р) «Ковчег», 2004.

Во як! Колькі яшчэ цікавостак можна адшукаць у розных прыватных і іншых архівах! Што й зрабіў колішні кіраўнік «Белорусского диксиленда» Авенір Вайнштэйн. І ў выніку атрымаўся цікавы дакумэнт з гісторыі беларускага джазу, які ўтрымлівае запісы калектыву з 1971, 1987 і 1988 гадоў. У розныя часы ў складзе калектыву выступалі вядомыя цяпер выканаўцы: піяністы Андрэй Шпянёў, Аркадзь Эскін, цяперашні лідэр «Мадэры хард-блюз» Юрый Міхайлаў, кантрабасіст Браніслаў Сармант, рокер першага прызыву бубнач Яўген Батыркін і іншыя. А адну песьню — расейскамоўную просьценькую «Песеньку пра дыксылэнд» (запіс 1987-га) выконвае тады яшчэ цалкам наша Алена Сьвірыдава.

Альбом, нягледзячы на зборны характар, пакідае мілае ўражаньне. У ім — колькі агульнавядомых «вечназялёных» тэмаў джазавае клясыкі, пара тэмак самога А.Вайнштэйна, «Песенька пра капітана» Дунаеўскага. Сам калектыў ня ўражвае нечым такім незвычайным: праект быў, хутчэй, хобі для прафэсійных музыкаў, сродкам выдаткаваць энэргію праз тую музыку, якой яны пастаянна не займаліся. І тым ня менш, у сольных эпізодах адчуваецца і майстэрства, і стыль. Вось і яшчэ адной белай плямай у гуказапісе краіны зрабілася менш.

**Дыксы-Слухач**

## Against the Destiny




Група «Mojo Blues». (р) «Ковчег», 2004.

Адна з найлепшых работ ня толькі ў беларускім блюзе за апошнія гады. Амаль пяць гадоў аматары гэтай групы чакалі новай праграмы, стварэньне якой зрабілася магчымым пасьля таго, як у складзе калектыву зьявілася Юлія Петрушкевіч, чый імклівы творчы рост проста ўражвае. Сёньня яна — яскравая і ўмелая сьпявачка, якая дасканала валодае рок-н-рольнай і блюзавай стылістыкай, аўтарка англамоўных тэкстаў песень. Вялікіх грошай запіс альбому музыкантам не каштаваў. «Mojo Blues» запісалі праграму проста са сцэны клюбу «Акварыюм». Якасьць — як у студыйнага запісу, настрой — канцэртны. Шкада, што ўсяго толькі 10 песень — шэсьць арыгінальных, чатыры кавэры.

Альбом можа стаць апошнім у кар'еры бубнача «Сузор'я», «Зіндана», «Крамы» і іншых калектываў Андрэя «Філа» Філатава, які па ўнушальнай прэзэнтацыі альбому ў малой залі Палацу Рэспублікі заявіў, што пакідае гурт. Але прыжыцьцёвыя помнікі ён мае. Дай бог усім такія!

**Можа-Слухач**

## Сканчаецца «Лістапад»

На XI Менскім міжнародным кінафэстывалі «Лістапад» дэманструецца 17 фільмаў. За кінафорумам можна сачыць праз сайт фэстывалю (listapad.com).

## Быкаўскі пленэр вандруе

Паводле вынікаў праведзенага на радзіме Васіля Быкава пленэру 9 сьнежня адкрылася выстава ў Наваполацку. Як сьцьвярджае віцебскі мастак Міхась Ляўковіч, наступным горадам, дзе будзе дэманстравацца выстава, стане Віцебск, а затым выстава будзе паказана ў касьцёле Сьв.Сымона і Алены ў Менску. Налета плянуецца правядзеньне мастацка-літаратурнага пленэру, прысьвечанага 75-годзьдзю Караткевіча.

## Кінаваўкі

Сябры наваполацкага рыцарскага аб'яднаньня «Жалезны воўк» здымаюць дакумэнтальную стужку «Ад Грунвальду да Мальбарку». У аснове фільму — здымкі з фэстаў сярэднявечнай культуры. Для «Жалезных ваўкоў» гэта ня першы кінадосьвед: яны ўдзельнікі расейскага блякбастэру «Начная варта».

## Атамная бомба ад «U2»

Рок-гурт «U2» выдаў новы альбом «How to Dismantle an Atomic Bomb» («Як разабраць атамную бомбу»). Папярэдні альбом гурту зьявіўся ў 2000 г. Лідэр гурту Бона сказаў, што «атамная бомба», вынесеная ў назву, — гэта ён сам: «Яна выбухнула 3 гады таму, калі памёр мой бацька». На альбоме Бона прысьвяціў бацьку дзьве песьні, некалькі песень — жонцы Алі.

## Узнагароды MTV

У Рыме адбылася цырымонія ўзнагароджаньня MTV «Europe Music Awards». Частка шоў адбывалася ў рымскім Калізэі. Найлепшым гуртом названы амэрыканскі рэп-гурт «Outkast». Найлепшай песьняй і найлепшым відэа прызнаны твор гэтага ж гурту «Hey Ya». Найлепшым выканаўцам стаў Ашэр, а яго альбом «Confessions» названы найлепшым. Брытні Сьпірс названая найлепшай сьпявачкай, а дэбютам году — гурт «Maroon 5». Званьне найлепшага рок-гурту дасталося «Linkin Park», найлепшага поп-гурту — «Black Eyed Peas».

## Музэй мядзьведзяў

На гары Вітоша каля сталіцы Баўгарыі — Сафіі — створаны музэй мядзьведзяў. На самой Вітошы дагэтуль жыве дзясятак дзікіх мядзьведзяў.

## Шрэк — асобна, Кот у ботах — асобна

Кінакампанія «Dreamworks» мае здымаць мультфільм пра Ката ў ботах — аднаго з герояў мультфільму «Шрэк-2». Сюжэт фільму яшчэ ня вызначаны. Агучваць Ката ў ботах па-ранейшаму павінен Антоніё Бандэрас.

**АВ, Міхал Чарвінскі; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Махеравая зіма



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У гэтую зіму наймадней уваходзіць у махеравых рэчах. Цёплы і ўтульны, махер надасьць адчуваньне дому і абароненасьці халоднымі сьнежаньскімі днямі. Не такая ўжо і няшчадная гэтая мода, і прыгажосьць не заўсёды патрабуе ахвяр.**

Тэда Лі

Часам у вагоне мэтро сядзіць *такая* дзяўчына (гэта здараецца далёка ня кожны раз, таму не зьвярнуць увагі было б несусьветным сьвінствам). На ёй рэчы неймаверных колераў у незвычайным спалучэньні. У руках — дзіўная сьмешная кайстарка, у плэеры — «Aphex Twin» ці «Portishead», на каленях — тры пачатыя кніжкі, кожнай зь якіх яна здраджвае зь іншай праз кожныя пару хвілін. Няўрымсьлівая асоба па-інакшаму мысьліць і апранаецца таксама незалежна ад людзкой масы. А маса тым часам цыркулюе на станцыях і пранізвае дзяўчыну дзясяткамі позіркаў, сярод якіх адшукаць зычлівы ці, прынамсі, па-добраму зацікаўлены цяжка.

Мяне заўсёды зьдзіўляла, чаму кожны неардынарна апрануты чалавек з пачуцьцём густу і ўласнага стылю ў нашай краіне атрымлівае куды больш нэгатыўную ацэнку, чым любая тыповая дзеўка «шлюшыстага» іміджу ці радавы калдыр у «скуранцы» і спартовым трыко. Калі нашыя падпэнсійныя кансэрватары стаяць на варце грамадзкай маралі, здавалася б, каму як ня ім найперш хвалявацца з тае прычыны, што выгляд прастытуткі культывуецца сярод беларускіх паненак як эталён прыгажосьці. Тыповая беларуская цётка ці дзядзька сталага веку будуць з ваяўнічай непрыязнасьцю разглядаць чыесьці кеды і шалікі, затое на вечаровы цёмна-бліскучы макіяж дзевяцікласьніц, якія едуць на кантрольную па геамэтрыі, вызьвервацца ў нас ня стануць.

Але гэты артыкул — не маніфэст стылю і густу. Тыя, каго нам выхоўваць, нас не чытаюць, і мы ўжо прывыклі. Сухой восені на пяткі наступае новая зіма, а да новага сэзону мы, як заведзена, мусім асьвяжыць гардэроб.

Пакуль тое, самыя прасунутыя ўжо даўно зразумелі, што модныя і патрэбныя рэчы можна набыць толькі за мяжой. А самыя разумныя ды хітрыя скемілі, што можна яшчэ дастаць стары татаў палітон і перакроіць яго сабе на спадніцу, а па астатняе наведацца ў менскую ўнівэркраму «Беларусь», між бясконцых вопратковых радоў якой часам адкопваецца самае жаданае коштам у паўстыпэндыі.

Слова «мэнінгіт», народжанае нашымі старэйшымі ў мінулазімовых сямейных размовах, хутка зноў пачне палохаць нас з усіх крыніц масавай інфармацыі. Цяпер мы ўжо ведаем, што ня варта бегчы па вуліцы зь недасушанай касой, а яшчэ трэба тэрмінова прыдумаць сабе шапку. У модзе паранейшаму застаюцца вязаныя кепкі а-ля Олівэр Твіст, бэрэты, шапкі з пампонамі і вязаныя скафандры з выразам для твару ці толькі для вачэй. Усялякія каўпакі ў стылі 20-х гадоў — джазавай эпохі — таксама на самым піку папулярнасьці. Дый капелюшы з шырокімі крысамі ніхто не зьбіраўся адкладаць на наступны год. Адзіная ўмова — капялюш мусіць быць колеру «вырві вока».

Самы шанаваны абутак узімку — каляровыя гумавыя боты, якія, аднак, ня пойдуць для асабліва нізкіх тэмпэратур. Многія прыстойныя фірмы ўжо выставілі свае мадэлі гэтага цуду ў новых зімовых калекцыях.

Усё яшчэ модныя вязаныя безрукаўкі, надзетыя на квяцістыя паласатыя сарочкі або кашулі ў гарошак.

Сярод верхняй вопраткі зноў модныя курткі-аляскі — вопратка эскімосаў, — іх таксама ўжо ўзялі на ўзбраеньне «Prada», «Burberry» і іншыя глямурныя дамы модаў.

Замша, мех і скура заўсёды лічыліся матэрыяламі для зімовай вопраткі. Ніхто і ня думаў спрачацца, толькі ў гэтую зіму наймадней уваходзіць у махеравых рэчах. Цёплы і ўтульны, махер надасьць адчуваньне дому і абароненасьці халоднымі сьнежаньскімі днямі. Не такая ўжо і няшчадная гэтая мода, і прыгажосьць *не заўсёды* патрабуе ахвяр. Байкавыя піжамы, ваўняныя, напалову ваўняныя і акрылавыя кардыганы, шалікі і шкарпэткі вельмі актуальныя ў новым сэзоне. Мода пераасэнсавала пытаньне зручнасьці і вярнула вялізныя, як коўдры, пончы. Балёневыя курткі зь вязанымі сьпінамі таксама падыдуць для канца восені і ўжо хуткага пачатку зімы.

Гэта самае асноўнае, што раяць нам часопісы і модныя крамы. Аднак гэта далёка не асноўнае, чым трэба кіравацца, апранаючыся кожным ранішнім зімовым прыцемкам. У сваіх тоўстых пушыстых апранахах абараняйцеся ад холаду і хваробаў, а яшчэ — уцякайце ад аднастайнасьці і пазьбягайце банальнай пошласьці.

Я і сяброўка мая Наста маем адну на дваіх звычку. Я кажу ёй: «Ты сёньня вельмі па-эўрапейску выглядаеш», — а яна сьмяецца: «Значыцца, сёньня можна не разьлічваць на ўвагу *пацаноў*».

Хочацца верыць, што калі-небудзь увага *пацаноў* будзе цалкам належаць толькі ім самім…

### Модна ў гэтым сэзоне

Вязаныя кепкі а-ля Олівэр Твіст, бэрэты, шапкі з пампонамі і вязаныя скафандры з выразам для твару ці толькі для вачэй, каўпакі ў стылі 20-х гадоў.Капелюшы з шырокімі крысамі колеру «вырві вока».

Вязаныя безрукаўкі, надзетыя на квяцістыя паласатыя сарочкі або кашулі ў гарошак.

Курткі-аляскі — вопратка эскімосаў.

Байкавыя піжамы, ваўняныя і акрылавыя кардыганы, шалікі і шкарпэткі. Вялізныя, як коўдры, пончы. Балёневыя курткі зь вязанымі сьпінамі.

# Квадрацыклам па лыжні



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Замерзлыя самотныя горы

Адсутнасьць гораў не дае падстаў ехаць па гарналыжны адпачынак за мяжу. Менчукам бліжэй Курасоўшчына, дзе месьціцца вучэбна-спартовы цэнтар. Штучны рэльеф тутака імітуе горныя вяршыні, працуюць пад'ёмнікі, а для падтрымкі сьнежнага покрыва ёсьць дзьве гарматы.

У Баярах (50 км ад Менску ў бок Маладэчна) месьціцца самы стары гарналыжны цэнтар на Беларусі. Яго пачалі асвойваць яшчэ з пачатку 70-х гадоў. Пасьля, цягам дзесяцігодзьдзя, абаранялі ад дачнікаў. Кажуць, што дайшлі да самога Машэрава. Месца было пакінута для разьвіцьця гарналыжнага спорту. У Баярах ёсьць пракат лыжаў.

Самы новы з гарналыжных праектаў — парк пад Лагойскам. Наведнікаў у ім, як і ў ягоным папярэдніку ў Раўбічах, няшмат. Кошты нятанныя, як і тамтэйшая лазьня. У Раўбічах можна зьняць хаткі.

Наагул, з усіх паркаў зімовага адпачынку ў Беларусі актыўна функцыянуе прыватны — «Якуцкія горы», што пад Койданавам. Там адзін раз падняцца на пад'ёмніку каштуе 1000 рублёў для дарослага, трохі таньней для дзіцяці. Гадзіна пракату гарналыжнай экіпіроўкі каштуе тут 10—15 тысяч, а на дзень — да 27 тысяч рублёў. З астатніх паслуг — сьнегаходы, квадрацыклы, снаўтубінг, кошт пракату якіх за адну гадзіну ці кілямэтар складае 8—10 тысяч.

### Канькі

Сярод таго, што яшчэ засталося ад адмыслова зімовага адпачынку, — каткі. У Менску іх каля пятнаццаці, яшчэ столькі ж лыжных трасаў. Самая папулярная коўзанка — Лядовы палац на Прытыцкага. Масавае катаньне праходзіць на ўік-энд. Жыхары абласных гарадоў таксама маюць гэткія пабудовы. Сярэдняя цана за гадзіну — 5—10 тысяч, у залежнасьці ад узросту наведнікаў і таго, ці бераце вы на пракат канькі.

### Зімовая саўна

Актыўны адпачынак узімку можна наладзіць і ў боўлінг-цэнтры. Цана — ад 12 да 22 у.а. за гадзіну. За 15—20 даляраў можна наведаць тэнісны корт. Більярд абыдзецца ў 2—5 у.а.

У менскіх басэйнах кошт аднаго сэансу вагаецца ад 2 да 8 тысяч рублёў. Наведаньне саўны сёньня каштуе ад 2 тысяч. Праўда, гэта агульнае аддзяленьне. Асабістая кабінка каштуе каля 40 тысяч рублёў за гадзіну.

# Ганна ў аптэцы

## Прыгожа хварэць не забароніш

Алесь Кудрыцкі

Ганна, мая знаёмая, не баіцца хваробаў. «Насмарк? Грып? Гэта для тых, хто ня ведае, як пазьбегнуць гэтае трасцы!» — самаўпэўнена фыркае яна і кіруе свае крокі ў найбліжэйшую аптэку. Не ў якую там экс-саўдэпаўскую, а ў дарагую, прыватную, балазе іх у сталіцы хапае.

Зялёны крыжык на рэклямнай шыльдзе — гэта плюс, станоўчы настрой, прыбаўка здароўя, думае Ганна і, цокаючы абцасікамі, падбягае да вітрын. Ну хто сказаў, што здароўя за грошы ня купіш?

Пачнём з дробязяў. Што калі ў горле заказыча на перамовах з босам? Дапамогуць ледзяшы. Лімон, мята, эўкаліпт, вішня-ацэрод, мультывітамінная начынка, адрэналінавая сумесь «кафэін-таўрын-гуарана», жэньшэнь… І ўсяго якіясьці 1500 бел. руб. за пакуначак?! Бяром. Для капрызнай дачкі — гомэапатычныя карамэлькі ад болю ў горлачку са смакам малінаў ці апэльсынаў (3 тыс.).

А калі сапраўдны кашаль? Тады — капсулы з таблеткамі-шыпучкамі па 5 тыс. (закіньце ў шклянку з вадой, толькі не з-пад крана) ці сыроп (з чабаром, падбелам, трыпутнікам, чорнай бузінай) па 5—6 тыс. за бутэлечку. Як у горле зусім задзярэ, выкарыстаем спрэй «для зьняцьця запаленьня ротавай поласьці» (з шалфэем, календулай, дзядоўнікам, мальвай, ісьляндзкім мохам ці проста зь вітамінам С) за 5… не, лепей гэты, за 7 тыс. Кардынальны сродак — хуткадзейны распушчальны парашок, які і абязбольвае, і гарачку зьбівае — 8—9 тыс. за пачак (10 пакецікаў).

Што калі пацякло з носа? Гэтай частцы твару пашанцавала: для носа прыдумалі каплі, мазі (а для іх — плястыкавыя палачкі з ватнымі камячкамі на канцы, паўтары тысячы рублёў за 100 шт.), спрэі і нават ролікавы аловак («У-у, відаць, гэта ня дужа прыемна», — моршчыць Ганна носік). Цэны — ад 2 да 20 тыс. Баваўняныя насоўкі — каменны век, цяперака набываем аднаразовыя папяровыя сурвэтачкі (звычайныя, араматызаваныя, увільгатнёныя сьпіртам — супраць мікробаў) ад 250 руб. за пачачак кішэннага памеру.

Па бабуліных рацэптах — травы ў каляровых пакунках па 50—100 г (каля 2000 тыс.) Ваўчкі, наготкі, крапіва, трыпутнік — для інгаляцый, піць, паласкаць рот ды горла. Прымружыўшы вока, Ганна прыглядаецца да прыгожага партатыўнага інгалятара за 270 тыс., аднак урэшце вырашае сёлета зноў абысьціся каструлькамі ды ручніком.

Кантрольны стрэл па ўсіх хваробах разам — унівэрсальны асьпірын-шыпучка (ад 5 тыс.).

«Зусім забылася на атыповую пнэўманію!» — войкае Ганна ды хапае з тузін павязак — ня з марлі, такіх ужо не прадаюць, а з блакітна-зялёнай папяровай тканіны, складзенай гармонікам (210 р. за штуку).

Кіруючыся да касы, Ганна мімаходам кідае погляд на аграмадную вітрыну зь вітамінамі (распушчальныя, жавальныя, у капсулах, у таблетках, дражэ, сыроп, цукеркі), але спакусе не паддаецца. Вітаміны — асобная песьня, вартая адмысловага паходу ў аптэку. Хіба што на ўсялякі выпадак прыхапіць аскарбінавай кісьлаты? Нягледзячы на выбар з трох-чатырох разнавіднасьцяў, Ганна набывае стосік белых таблетак, загорнуты ў цэляфан з малюнкам, што не зьмяніўся з часоў напаўзабытай БССР, — настальгія па дзяцінстве.

Што зрабіць, калі па колькасьці цікавостак ды прынадаў сучасная скарбонка здароўя годна спаборнічае з цукернямі ды крамамі парфумы! А калі раптам і захварэеш — колькі найноўшых прыдумак можна будзе перасправабаваць! «Вось нават і пакецік фірмовы далі!» — цешыцца Ганна. Зіма на носе — хіба ж гэта не цудоўна?




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Прышчэпка супраць грыпу бясплатная

### Кожны ахвотны можа зрабіць вакцынацыю па месцы жыхарства

Штогод у Беларусі на грып хварэе ад 250 тысяч да мільена чалавек. За апошнія пяць гадоў у краіне ад грыпу памерла каля 60 чалавек. Паводле прагнозаў Нацыянальнага цэнтру грыпу, эпідэмія пачнецца ў сярэдзіне студзеня. Шмат хто задае сабе пытаньне: ці варта рабіць прышчэпку? І як?

Грып — гэта вельмі небясьпечнае вірусная захворваньне, якое прыводзіць да цяжкіх ускладненьняў, а часам нават да сьмерці. Хвароба праходзіць з высокай тэмпэратурай, болем галавы і мускулаў, агульнай млявасьцю. Менавіта таму дактары раяць абавязковую вакцынацыю групам павышанай рызыкі, да якіх належаць людзі з захворваньнямі дыхальнай, сардэчна-сасудзістай і эндакрыннай сыстэм, ырачнай недастатковасьцю, асобам, старэйшым за 65 гадоў, тым, хто працуе зь людзьмі.

Вакцынацыя ў некалькі разоў больш эфэктыўная, чым агульнаўзмацняльныя і гомэапатычныя сродкі. Вірус грыпу схільны да пастаяннай мутацыі, таму кожны год робіцца адаптацыя вакцыны да тых відаў вірусу, якія чакаюцца. Прагноз па цыркуляцыі вірусаў грунтуецца на дадзеных міжнароднай маніторынгавай сеткі пад эгідай Сусьветнай арганізацыі аховы здароўя. Штамавы склад вакцын гэтага году: А/Новая Каледонія, А/Фуцьзянь, В/Шанхай.

Сёлета кожны ахвотны можа атрымаць бясплатную вакцынацыю супраць грыпу па месцы жыхарства, у раённых паліклініках. Прышчэпкі робяцца вакцынамі расейскай вытворчасьці «Грыпол» і «Грыпаў». У прыватных мэдычных цэнтрах ўжываюцца звычайна вакцыны заходнеэўрапейскіх вытворцаў, але за гэта прыйдзецца плаціць 17—25 тыс. рублёў.

Ня робіцца вакцынацыя асобам, алергічным на курыны бялок і пасьля нядаўняй хваробы. Імунітэт, які ствараецца вакцынай, захоўваецца каля 12 месяцаў.

**Алесь Трафіменка**

## Дзе беларусы могуць адпачыць гэтай зімой

### Гразі — за 10%

А яшчэ ўзімку можна зьездзіць вылежацца ў санаторыі. Ёсьць тыя, дзе лечаць мінэральнымі водамі. У санаторыі «Баравое» (каля Бегам'я), прыкладам, двухмясцовы нумар абыдзецца 16 у.а. за суткі. У «Чабарку» пад Баранавічамі да водаў дадаецца гразелячэньне. У кошт уключана штодзённае наведваньне басэйну і чатырохразовае харчаваньне. Нумары «люкс» абыдуцца ў 400—500 тысяч рублёў, а вось простыя двухпакаёвыя — ад 360 тысяч на 12—14 дзён. Для дзяцей зьніжка амаль у два разы.

### Мінус дзесяты паверх

А чаму б не паспрабаваць зімою самы экзатычны від санаторнага адпачынку — спэлеалекаваньне? У Беларусі адзінае месца такога тыпу — Рэспубліканская бальніца спэлеалекаваньня ў Салігорску. На глыбіні 430 мэтраў у выпрацаванай шахце хворыя могуць адпачываць, удыхаючы іоны сыльвініту. У шахтах абжыта некалькі гарызонтаў з натуральнымі пакоямі ў калійным і саляных слаях. Курс лячэньня — 18 дзён, прычым уласна падзямельнага — 6 гадзін удзень ці 12 ноччу. Кошт комплекснай праграмы ад 190 у.а. Гэтая падзямельная санаторыя прызначаная найперш для хворых на астму ці іншыя лёгачныя немачы, і пуцёўкі распаўсюджваюцца праз аддзелы аховы здароўя. Але прайс-лісты бальніцы прадугледжваюць і продаж пуцёвак прыватным асобам.

### Папса і эліта

Зіма — таксама пік клюбнага жыцьця сталіцы. Самыя дарагія клюбы — элітныя «Алькатрас», «Бронкс», «Мэдысан», «West World» і «Белая вежа». Там маецца фэйс-кантроль, а цэны на квіткі вагаюцца ад 10—20 тысяч да (часам) бясконцасьці. Музычнае суправаджэньне — жывыя выступы музыкаў.

Дзіцяча-юнацкія, больш танныя пляцоўкі — гэта «Юла», «Тунэль» і «Дынамік». Там тусуюцца студэнты. У гэтых клюбах круціцца збольшага папса. Цэны — якраз для студэнцкага кашалька: 5—8 тысяч рублёў. Яшчэ адзін «дзіцячы» клюб — «Бліндаж». З рэшты — гей-клюб «Бабілён», а таксама «Лео» і «Максымус», што пакуль не пазыцыянуюць сябе на клюбным рынку аніяк.

У «Шайбе» (другая назва «WWC») нярэдка выступаюць гастралёры, таму і лічыцца гэтая «кропка», што прымыкае да гатэлю «Беларусь», прэстыжнай. Публіка, праўда, часьцяком не беларуская.

Ніяк не пазыцыянуе сябе на рынку клюб «Лео». То праводзіць дыскатэкі ад «1-га музычнага», то канцэрты «N.R.M.». Цяпер новы паварот — канцэрт «За Беларусь!» з удзелам «Indigo» і прэзэнтацыяй шматпакутнага праэкту Беларускага ліцэю «Веру ў цябе: Я люблю Ліцэй!».

Па закрыцьці «NC» альтэрнатыўная тусоўка перацякла ў «Дынамік» (інакш «Мэдыюм») і «28» («Рэмікс 82»).

«Тунэль», здаецца, выйшаў з барацьбы за першынство, дый знаходзіцца ён далёка ад цэнтру. Вынік — «для мясцовых».

Беларускую музыку найчасьцей можна пачуць у «Экстрыме». Шэраг канцэртаў прайшоў у «Рэактары». А вось «Бліндаж» пасьля славутай «другой забароны» на выступ ліцэістаў і рокераў, сышоў у падполье. Простая дыскатэка пацаной і дзевачак.

**Сяргей Дэнскі**

### Ці рабіць прышчэпку? Так! – кажуць дактары Анея і Зьміцер Бань



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**— Як зьберагчыся ад грыпу?**

Марлевыя маскі, загартоўваньне, полівітаміны. Карысна есьці цыбулю, часнык па 2—3 зубкі штодня. Аднак усё гэта недастаткова эфэктыўна.

**— А што эфэктыўна?**

Найлепшы сродак — прышчэпкі, эфэктыўныя ў 70—100% дзяцей і асобаў, маладзейшых за 60 год.

**— Калі рабіць прышчэпку?**

Аптымальна — зь верасьня да лістапада. Час выпрацоўкі імунітэту займае каля 2—4 тыдняў.

**— Ці можна захварэць грыпам пасьля прышчэпкі?**

Можна. Але прышчэпленыя людзі пераносяць грып лягчэй, чым непрышчэпленыя.

Жадаем здароўя.

# Дамова–2006

## Апазыцыя вызначыць працэдуру адзінага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах да 20 сьнежня

Мінулы ўік-энд лідэры апазыцыі правялі ў Вільні. У дашчэнту зьмерзлы Менск яны вярнуліся не з пустымі рукамі — прывезьлі дамову аб аб’яднаньні і выпрацоўцы стратэгіі сумесных дзеяньняў на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. Акрамя лідэраў «Пяцёркі+», яе падпісалі старшыня БСДП (НГ) Мікола Статкевіч, Валянціна Матусевіч ад Партыі жанчын «Надзея», а таксама прафсаюзны лідэр Аляксандар Бухвостаў і моладзевыя лідэры Ўладзімер Навасяд ды Павал Севярынец. Выглядае, што байкоту ня будзе: апазыцыя пойдзе на поўнамаштабны ўдзел у выбарах 2006 г.

Прэзыдэнцкая гонка распачалася, і апазыцыя мае намер скіраваць яе ў пэўнае рэчышча, але ў якое — пакуль ня вызначана. Вылучаць адзінага кандыдата трэба, але паводле якога мэханізму? Адказ на гэтае пытаньне трэба адшукаць да 20 сьнежня — такі «дэдлайн» паставілі перад сабою апазыцыйныя лідэры. Першае пасяджэньне Стала дзейнай народы дэмакратычных сілаў, якая зґуртавала падпісантаў «дамовы-2006», прайшло 24 лістапада.

Тым часам пад пагрозай зрыву апынуўся сход дэмакратычных кандыдатаў у дэпутаты палаты прадстаўнікоў, а таксама тых вылучэнцаў, якія не былі зарэгістраваныя ці не здолелі трапіць у парлямэнт. Ён меўся адбыцца 28 лістапада, але нават апошні незалежны бастыён — Міжнародны адукацыйны цэнтар (IBB) — здаўся пад націскам уладаў ды адмовіў арганізатарам у памяшканьні. Правядзеньне сходу перанесьлі роўна на тыдзень — на 5 сьнежня. У выпадку чарговай адмовы, кандыдатаў зьбяруць у замежжы, але пакуль такі варыянт дэталёва не разглядаўся.

Галоўная мэта сходу — абмеркаваць вынікі выбарчай кампаніі-2004 ды параіцца, што варта рабіць далей у рамках кампаніі па вылучэньні адзінага кандыдата на пасаду прэзыдэнта. «Але важна й тое, што лідэры партыяў «Пяцёркі+» павінны сказаць «дзякуй» тым людзям, якія рэальна выкладаліся падчас выбарчай кампаніі», — кажа Алесь Міхалевіч (Партыя БНФ).

Пра ідэю стварэньня Народнага парлямэнту ніхто ня згадвае. Сход кандыдатаў будзе праведзены толькі адзін раз, падчас яго ніякіх сталых органаў створана ня будзе. Але нават такі «фармат» выклікае ва ўладаў пачуцьцё небясьпекі, бо яны як агню баяцца ўбачыць у адной залі дзьвесьце з гакам незалежных палітыкаў з досьведам выбарчай барацьбы. Відавочна, што кандыдаты ў дэпутаты — наймацнейшыя актывісты з рэгіёнаў, за якімі стаяць рэальныя выбаршчыкі. Удзельнікі сходу будуць здольныя прапанаваць годныя кандыдатуры для ўдзелу ў дэмакратычных «праймэрыз».

**Алесь Кудрыцкі**

# Яе сэрца зьлева

**На пытаньні «НН» адказвае Нэлі Шчасная, кіраўніца справаў Менскай гарадзкой арганізацыі БСДГ, упаўнаважаная прэзыдыюму «Маладой грамады» па сувязях з грамадзкімі арганізацыямі і палітычнымі партыямі, каардынатарка «Студэнцкай ініцыятывы».**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«НН»: Мне сказалі, што гэта ты прыдумала лёзунг беларускіх сацыялістаў «Тваё сэрца зьлева»?**

**Нэлі Шчасная:** Яшчэ ў 1998 г. на сэмінары ў Кіеве, дзе прысутнічалі прадстаўнікі адной кансэрватыўнай партыі, здаецца, чэскай, мне запомніўся адзін іхны плякат. Гэты плякат ні да чога не заклікаў, ён проста паказваў са сьпіны чалавека, які едзе на эскалятары ў мэтро, і ўнізе быў надпіс: «Дзякуй, што вы стаіце справа». І тады я пачала думаць — якая ж можа быць асацыяцыя з чымсьці левым, якая была б усім зразумелая…

**«НН»: Хадзіць налева, левы заробак…**

**НШ:** Так, менавіта такія асацыяцыі і прыходзяць у галаву, і мне гэта зусім не падабалася. І на зваротным шляху я падумала пра тое, што ёсьць у кожнага чалавека. Гэта — сэрца, ува ўсіх сэнсах, ня толькі ў фізычным. Так і ўзьнік гэты лёзунг, і прыжыўся.

**«НН»: У мяне такое ўражаньне, што жанчыны ў палітыцы ўсё больш зьлева…**

**НШ:** Можа быць, я не рабіла такіх замераў. Пэўны сэнс у гэтым хіба ёсьць. У прынцыпе, кансэрватыўная ідэалёгія прадугледжвае для жанчыны нейкае вызначанае месца. Левая ідэалёгія гэтага месца не прадугледжвае, таму, можа, жанчынам тут лягчэй рэалізавацца.

**«НН»: Чым прывабная левая ідэалёгія для цябе і чым можа быць прывабная для Беларусі левая ідэя?**

**НШ:** Я лічу, што ідэалёгія — гэта перадусім лад жыцьця. Мой лад жыцьця больш зьвязаны зь левымі каштоўнасьцямі.

Левая ідэя для Беларусі прывабная тым жа, чым яна прывабная ва ўсім сьвеце. Паводле сацапытаньняў, калі людзей пытаюцца пра каштоўнасьці, то ў ліку першых беларусы ставяць справядлівасьць. Для іх гэта вельмі важна, бо яны так доўга жывуць у атмасфэры двайных стандартаў, кухонных прызнаньняў і ў той жа час яўнай сацыяльнай хлусьні.

Справядлівасьць — адна з важных каштоўнасьцяў для мяне, як і для большасьці беларусаў. Людзі адчуваюць, што нешта адбываецца насуперак іх волі, яны адчуваюць, што гэта несправядліва ў дачыненьні да іх, да іх дзяцей.

**«НН»: А нацыянальная ідэя?**

**НШ:** Мне ня блізкі нацыяналізм, хаця я і вучылася ў Беларускім ліцэі — мой выпуск быў другі. У любой ідэалёгіі ёсьць нейкія станоўчыя моманты. Чалавек заўсёды выбірае тое, што пасуе яму. Немагчыма быць адначасова і лібэралам, і нацыяналістам, і сацыялістам. Гэта не мая ніша, я спакойная за тое, што гэтая ніша ў нас занятая і ёсьць людзі, якія гэтым займаюцца і ў якіх гэта атрымліваецца.

Мне не падабаецца і мяне вельмі моцна адштурхоўвае ў любой кансэрватыўнай ідэалёгіі стаўленьне да іншых людзей, да іншых у шырокім сэнсе слова — да нацыянальных, сэксуальных меншасьцяў і г.д. Я лічу, што кансэрватыўная ідэалёгія, нацыяналістычная ідэалёгія агрэсіўная паводле сваёй сутнасьці. І мне гэта зусім ня блізка.

**«НН»: Вось Лукашэнка — левы палітык…**

**НШ:** Вы памыляецеся!

**«НН»: Але здаецца, пераплюнуць яго ў ягонай левізьне…**

**НШ:** У ягоным папулізьме яго вельмі складана пераплюнуць і левым, і правым. Ён і нацыяналіст таксама. Цяпер новае пакаленьне — пакаленьне патрыётаў. Я думаю, што ніякі «Малады фронт» ня выхаваў столькі патрыётаў, колькі Лукашэнка. На глебе спорту, напрыклад. Ён такі ж левы, як і правы. Вельмі таленавіты папуліст. Нам часта задаюць гэтае пытаньне — дзе ж вы будзеце, левая ніша занятая дзяржавай. Яна насамрэч не занятая. Усё, што можна зрабіць у гэтым абсягу, ня зроблена. Тое, што дэкляруецца, — пэнсіі, заробкі, сацыяльная дапамога — гэта ўсё вельмі далёка ад таго, як павінна быць у рэальнасьці.

**«НН»: Цяпер шмат кажуць пра страх, запалоханасьць грамадзтва. Што з гэтым рабіць?**

**НШ:** Так, гэта складанае пытаньне. Страх — гэта самы магутны рэсурс улады. Гэта замкнёнае кола, зьвязанае з замкнёнасьцю інфармацыйнай прасторы.

Як толькі гэтая замкнёнасьць нейкім чынам разарвецца, то можна будзе нешта зрабіць. А цяпер са страхам хіба толькі асабістым прыкладам можна змагацца. Задаваць пытаньні трэба людзям. Крытычнасьць мысьленьня — адна з уласьцівасьцяў грамадзяніна, якой вялікая частка беларусаў амаль не валодае. Яны спажываюць інфармацыю, яны яе не аналізуюць. Калі я гавару зь людзьмі, я бачу, што ўсё, што трэба — гэта задаваць пытаньні. Калі табе выдаюць гатовыя фразы, пачутыя ў тэлевізары, пачынаеш задаваць пытаньні. Пытаньне ўжо патрабуе нейкага адказу, уласнага аналізу. Чалавек задумваецца, а што ж ён пра гэта думае, пачынае адказваць на тваё пытаньні і часам прыходзіць да высноў, цалкам для сябе нечаканых. Вось такая форма барацьбы са страхам магчымая, у тым ліку са страхам у сабе.

Я не настойваю на тым, каб усе людзі ў Беларусі займаліся палітыкай ці нават цікавіліся палітыкай. Насамрэч у нас вельмі палітызаванае грамадзтва. Гэта ненармальна. Людзі не павінны ў такой ступені цікавіцца палітыкай, але яны павінны быць палітычна пісьменнымі. У пачатковай школе, у сярэдняй школе мае быць грамадзянская адукацыя. Людзі абавязаныя ведаць, што такое Канстытуцыя, што гэта Асноўны закон, і паважаць яго. Людзі павінны ведаць, што такое дэмакратыя, грамадзянін, правы чалавека, што такое парлямэнт і навошта яго выбіраць. Калі чалавек усяго гэтага ня ведае і цікавіцца палітыкай на ўзроўні «дурань!» — «сам дурань!» ці «Лукашэнка добры» — «Лукашэнка кепскі», то мы маем тое, што маем цяпер.

**«НН»: Як ты бачыш блізкую будучыню?**

**НШ:** 2005 год — год, які дасьць нам магчымасьць для мабілізацыі, для працы перадусім з моладзьдзю. Была створана «Студэнцкая ініцыятыва», будзем працаваць са студэнцтвам. З малодшымі курсамі працаваць цяжка, яны не заангажаваныя, нарадзіліся і выраслі ў гэтай сыстэме. Прасьцей працаваць са старэйшымі, людзьмі, якія здольныя да крытычнага мысьленьня, якія могуць ацэньваць сытуацыю адэкватна. Але заклікаць мы будзем усіх і працаваць з усімі, хто да нас прыйдзе.

Натуральна, я гляджу з аптымізмам у будучыню тут, у Беларусі. Я ня бачу для сябе іншага месца. Любы палітык, які лічыць сябе прафэсійным палітыкам, ня можа быць пэсымістам, інакш ён ня будзе займацца палітыкай. Калі гэта адбудзецца — я маю на ўвазе эміграцыю, — то гэта адбудзецца вымушана.

Палітычныя эмігранты, на маю думку, у вельмі вялікай частцы — людзі, якія ня маюць да палітыкі ўвогуле ніякага дачыненьня. І гэта сумна. Людзі, якія сур’ёзна займаюцца палітыкай, не паедуць, бо яны адчуваюць, што яны могуць рэалізаваць сябе толькі тут.

**«НН»: Як ты лічыш, палітыка не замінае асабістаму жыцьцю?**

**НШ:** Нельга сказаць, што калі ў чалавека ёсьць асабістае жыцьцё, то ён больш нічым не займаецца, а займаецца сваім асабістым жыцьцём. Не, гэта няпраўда, ёсьць людзі менш актыўныя, больш актыўныя. Натуральна, палітыкай, грамадзкай дзейнасьцю займаюцца людзі больш актыўныя. І з той прычыны, што яны больш актыўныя, ім, насамрэч, хапае часу на ўсё — і на асабістае жыцьцё, і на грамадзкае. Пасьля таго, як у людзей зьяўляецца сям’я, калі ў іх не хапае часу на грамадзкае жыцьцё, яны сыходзяць. Адбываецца такі натуральны адбор. А людзі, якім хапае часу на ўсё, застаюцца, становяцца прафэсіяналамі.

**Гутарыў Алесь Пяткевіч**

# Рэквіем па мары

**«Уліс» — няспраўджанае і недасяжнае. З нагоды выданьня бокс-сэту групы «Ўліс»: «Чужаніца» (1989), «Краіна доўгай белай хмары» (1990), «Танцы на даху» (1993).**

Цэлыя выходныя з маёй сідзічкі (упершыню не з касэтніка!) гучаў стары «Ўліс»: тры гадзіны, 44 песьні, а потым зноў ды зноў… «Яны зьядуць мяне, пакуль сьпяваю…»

Калі «Ўліс» ірваў залі Нямеччыны і Польшчы ў 1990-м, мне было восем год і мяне абсалютна не цікавіла, што такога ўздыму папулярнасьці ў айчынных альтэрнатыўных камандаў больш ня будзе ніколі, што літаральна праз тры гады самая таленавітая група ў тагачаснай Беларусі папросту загіне.

Зь цягам год «Уліс» пераўтвараецца ў легенду. Непазнаную легенду. Супрановіча варта ўзяць у гарачыя абдымкі — гэта той чалавек, які нарэшце наважыўся выдаць *той* «Уліс» на сучасных носьбітах… «Абудзі нас, калі пачнецца жыцьцё…»

Першыя тры альбомы «Ўлісу» для тых, хто нарадзіўся раней за мяне на год 10, — гэта напамін пра няспраўджанае. Дзе той маладзён Андрэй Патрэй, які жвава танчыў на сцэне і запальваў сваім надрыўным вакалам залю? Стаўся шчырым праваслаўным вернікам і жыве пад Воршаю… Дзе той шчыры паэта Фелікс Аксёнцаў, словы якога пра «Краіну ў кратах» разьляталіся па ўсіх канцэртных пляцоўках экс-БССР? Недзе на эміграцыі ў Канадзе (ці жывы?)… А што сталася з тым кучаравым таленавітым гітарыстам Коранем? Цікаўныя ўсё маглі ўбачыць 13 лістапада…

А дзе тыя імпэтныя гледачы, якія, відаць, меркавалі апынуцца ў Эўропе?.. «Калі імпэрыя зьнікне, як дым, дзе ты будзеш і з кім?..»

Для маладых прыхільнікаў беларускай музыкі «Ўліс» узору 1989—1993 зусім недасяжны. Нейкая ірэальная зьява — «вада з вытокаў ракі». Рэха таго нечуванага ўздыму сёньня не чуваць. Словы тых музычных маніфэстаў даўно забытыя. А нехта нават не ведае, што ТАК было калісьці.

Ва «Ўлісу» быў свой стыль, паўтарыць які немагчыма, свае фэны (і нават фэн-клюбы), сваё шоў з экспрэсіўнымі чытаньнямі Джойса, кантракты з буйнымі гуказапіснымі фірмамі (тая самая «Мелодия» і «Polskie Nagrania»), запрашэньні на канцэртныя пляцоўкі розных краін Эўропы, а таксама, што важна, была свая ідэалёгія, пабудаваная на філязофіі Аксёнцава. Мара, як на сёньня… «Навошта вы мне, навошта я вам?»

Для тых фэнаў «Улісу» перавыдадзеныя «Чужаніца», «Краіна…» і «Танцы…» могуць мець зусім іншае гучаньне, чым для заўзятараў майго ўзросту. Такі прадукт магчыма стварыць толькі на гістарычным зломе. Пры ўсьведамленьні таго, што падобны злом у найбліжэйшы час адбудзецца наўрад ці, песьні «Ўлісу» набываюць дадатковы смак. І могуць выклікаць сяды-тады няёмкія адчуваньні. Мяне, напрыклад, калі б я меў на гадоў 10—20 болей, падчас праслухоўваньня перасьледавала б адчуваньне недаробленасьці… Пад «Пляц Францыска» можна паразважаць, як яно магло б быць, калі б… Пасьля закусіць, выпіць і паплакаць… «Сум свой адчуваю я сам…»



Для таго, хто не адчувае аніякіх згрызотаў сумленьня, «Уліс» пачатку 90-х — найперш творчы ўзор. Ніводзін гурт у нашай краіне не дамогся такога шыкоўнага гучаньня, ніводзін вакаліст, за выняткам Вольскага, не сьпяваў такіх вострых песень. Плынь інтэлектуальнага і вострасацыяльнага року з тых часоў ссохла.

Думаецца, што з дапамогай гэтых трох дыскаў шмат хто яшчэ адкрые *той* «Уліс» для сябе. Ці ўпершыню, ці наноў. Але ўсё адно, гэтыя дыскі — як камень на магілу. Магілу, дзе пахаваны надзеі і мары. «Не пакіне нас надзея?..»

**Сяргей Будкін**

# Вецер з поўдня

**Працяг са старонкі 4.**

Дай бог, каб і ў нас зьявіліся постаці накшталт Русланы і братоў Клычкоў!

Аказваецца, варта быць актыўнымі. Калі хочаш свабоднага жыцьця, тваё месца не на кухні. Калі хочаш перамогі, будзь салідарным — з актывістам, якога табе загадалі лічыць экстрэмістам, з назіральнікам, якога не пускаюць да падліку галасоў, з журналістам, чые погляды не супадаюць з тваімі. Калі хочаш свабоднай адукацыі, тваё месца не ў Амэрыцы ці ў заднім двары ЭГУ. Калі хочаш дайсьці, не спыняйся.

Ва ўсім гэтым нам яшчэ далёка да Ўкраіны. Але Ўкраіна занадта блізкая, каб восень яе свабоды не падзейнічала на нас. Сотні тысяч такіх жа, як мы, — славян, большасьцю праваслаўных, якія не паддаліся замбаваньню тыпу «ўсе яны крадуць» і выйшлі абараняць свой выбар. Мільёны ўцямілі, што іх жыцьцё не залежыць цалкам ад зьместу лядоўні або ўраджаю на лецішчы. Мільёны тых, каму з экранаў тэлебачаньня прамывалі мазгі наконт «экстрэмістаў» і «нацыяналістаў», раптам убачылі на Майдане Незалежнасьці адлюстраваньне сваіх твараў. Мільёны тых, якім уся дзяржаўная, СНДоўска-назіральніцкая какафонія ўнушала пра «свабодныя і справядлівыя выбары», не паверылі.

А хто тады мы — нашы дзеці, нашы юнакі, нашы апазыцыянэры? Выходзіць, яны таксама не такія экстрэмісты, як іх падаюць беларусам? Выходзіць, і ў нас ня ўсё было чыста і празрыста, калі кідалі бюлетэні ў скрынкі? Выходзіць, Лябедзька зь Вячоркам маюць рацыю?

Мы ўбачылі яшчэ адну МІРНУЮ рэвалюцыю амаль што на нашай вуліцы. Адна такая падзея вартая трох гадоў прапаганды БТ. А мы ж, беларусы, таксама МІРНЫЯ людзі.

Украіна сапраўды занадта блізка ад нас, каб лічыць беларускую летаргію вечнасьцю. «Ніколі» і «назаўжды» — гэта толькі ілюзія. Для пачатку трэба пачаць верыць у сябе і перастаць — у Расею, Захад ці яшчэ нейкі цуд. Свабода магчымая насуперак усяму.

## Што трэба ведаць беларусам, або Ўтапічныя нататкі аб усім патроху

Беларусы здаўна звыклі на лёс наракаці. Гэтае нам забаронена, на тое грошай няма, дзеля трэцяга не хапае спэцыялістаў. Але цяпер я хачу забыцца на гэтыя нягоды і крыху памарыць аб тым, што трэба было б зрабіць нашым гуманітарам.

Пачну зь філялёгіі. У нас па сёньняшні дзень прынята глядзець на заходнебеларускую літаратуру як на папялушку. Мы старанна пералічваем усе крыўды, якія яна цярпела, падкрэсьліваем неспрыяльныя ўмовы. Усё гэта так. Але ўспомнім Лакснэса: «Раб, якога б'юць, можа стаць вялікім чалавекам. Сыты служка ім ня будзе». Параўноўваючы заходнікаў і ўсходнікаў, ня трэба нават і даказваць, што першыя былі і нашмат больш свабоднымі, і сапраўднымі выразьнікамі імкненьняў свайго народу. Таму, на маю думку, надышоў час зрабіць спэцыяльны курс па іх творчасьці. Зразумела, там павінна быць месца і камуністам, і эстэтам, і ксяндзам. Можа быць прадстаўлена і філязофская думка (Абдзіраловіч, Самойла...), і красамоўства — найлепшыя прамовы беларускіх пасloў у Сойме. А літаратурная дзейнасьць Язэпа Драздовіча — ці вядома яна ўвогуле? Асобнай увагі заслугоўвае заходні погляд на савецкі эксперымэнт. Тут павінны быць паказаны і ілюзіі наконт «Беларускага Дому» (публіцыстыка Тарашкевіча, «Лісткі календара» М.Танка), і цьвярозы погляд на «цэні» А.Луцкевіча, А.Станкевіча, Ф.Аляхновіча.

На савецкі час, калі ён нарэшце стаў гісторыяй (як бы каму чаго ні хацелася), надышла пара па-новаму зірнуць і нам. Не пашкодзіла б стварыць новую гісторыю Кампартыі Беларусі, дзе было б разгледжана ўсё: утварэньне, барацьба нацыянальнай і «інтэрнацыянальнай» плыняў, узаемаадносіны з цэнтрам, спробы кіраваньня культурай, прыродай, суб'екты і аб'екты рэпрэсій, роля камуністаў у гісторыі Заходняй Беларусі і ў вайне. У ідэале такая праца магала б стаць сапраўднай энцыкляпэдыяй беларускай гісторыі XX ст. Патрэбны таксама партрэты без прыхарошваньня А.Чарвякова, П.Панамарэнкі, П.Машэрава.

Зразумела, трэба ня толькі глядзець у мінулае, але і думаць пра будучыню — чаго ж мы хочам? Тут у нас вельмі дзіўная рэч: усе гавораць пра дэмакратыю, сацыяльную справядлівасьць, але што гэта, ніхто ня хоча растлумачыць народу. А яшчэ Сакрат казаў: «Зло ад тых, хто ня ведае». Патрэбна больш займацца палітасьветай грамадзтва ўсімі даступнымі сродкамі — праз газэты, брашуры, лекцыі. Патрэбна тлумачыць, што дэмакратыя — не панацэя, а сродак нам самім зрабіць сваё жыцьцё лепшым і таму немагчымая бяз нашага асабістага ўдзелу. Чаму б, напрыклад, ня скласьці даведку для выбаршчыкаў, дзе б расказвалася, як распазнаць парушэньні і што рабіць у такіх выпадках. Калі такія матэрыялы дойдуць да адрасатаў, можа, у нас зьявіцца больш крытычна настроеных, а галоўнае, актыўных грамадзян.

Беларусаў заўсёды цікавілі іншыя краіны, але даведацца пра іх ім даводзіцца пераважна з чужых рук. А чаму б ня выдаць (калі ён захаваўся) эспэрантысцкі архіў Маўра? А М.Матукоўскі, які сапраўды падарожнічаў па экзатычных краінах, няўжо не пакінуў нататак? Што тычыцца жывых, то добра было б, каб В.Мудроў напісаў пра «невядомую Альбанію», Я.Лапатка — пра Фінляндыю, В.Сёмуха (або Л.Баршчэўскі) — пра нямецкую літаратуру. Я ўжо не кажу, што варта лепш ведаць суседзяў.

Не пашкодзіла б нам мець сваю арыентадыстыку, ідэрляндыстыку, лузытаністыку (хоць бы дзеля двух клясыкаў сусьветнай паэзіі — Л.Камоэнса і Ф.Пэсоа).

Калі раптам высьветліцца, што хтосьці працуе у названых мной кірунках, я буду рады аб гэтым даведацца.

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

16 лістапада адміністрацыя Маскоўскага раёну Менску адмовіла ў перарэгістрацыі рэлігійнай суполцы **«Царква «Новае жыцьцё»**. Крымінальная справа супраць старшыні ГА «Воля да разьвіцьця» (Слонім) **Міхася Варанца** па абвінавачаньні ў нявыплаце падаткаў паводле праграмы TACIS спынена 17 лістапада. У Магілёве 17 лістапада за распаўсюд перадрэфэрэндумных улётак на адну базавую велічыню аштрафаваны актывіст «Зубра» **Мікалай Ільін**. 16 лістапада ў Горадні паводле падазрэньня ў распаўсюдзе ўлётак затрыманы актывісты Партыі БНФ **Вадзім Саранчукоў**, **Зьміцер Міхалюк**, **Максім Губарэвіч**. Саранчукова яшчэ аштрафавалі на 70 б.в. за ўдзел ва ўшанаваньні памяці братоў Каліноўскіх 31 кастрычніка ў мястэчку Сьвіслач. Рэдактара недзяржаўнай газэты «Борисовские новости» **Анатоля Букаса** 17 лістапада выклікалі да сьледчага з нагоды заведзенай на яго крымінальнай справы. Управа юстыцыі Менгарвыканкаму 17 лістапада зьняла з уліку **Серабранскую** й **Цэнтральную суполкі** ды **Сьвіслацкую** й **Кальварыйскую раённыя рады ПБНФ**. 17 лістапада прэс-сакаратара беларуска-расейскага фонду «За новую Беларусь» **Аляксандра Коктыша** выклікалі ў пракуратуру Заводзкага раёну Менску: праваахоўнікі ўбачылі парушэньні закону ў прэс-канфэрэнцыі, якую далі прадстаўнікі апазыцыі 21 кастрычніка ў рэдакцыі газэты «Московский комсомолец». **Марына Леванеўская**, жонка асуджанага Валер'я Леванеўскага, зьвярнулася 18 лістапада да генпракурора й іншых службовых асоб: у сям'і канфіскавалі маёмасьць больш як на 15 тыс. даляраў і 10 тыс. даляраў грашыма. На 6 б.в. аштрафаваны 18 лістапада кіраўнік РГА «Прававая ініцыятыва» **Леанід Судаленка** і на 5 б.в. — сябар АГП **Мікалай Ісачанка** за распаўсюд улётак. Шклоўскі райсуд 18 лістапада адхіліў скаргу рэдактара недзяржаўнай газэты «Шклоўскія навіны» **Аляксандра Шчарбака**, які абскарджваў штраф за распаўсюд улётак: суд палічыў, што сьведкі Шчарбака не заслугоўваюць даверу. Намесьніцу рэдактара «БДГ» **Ірыну Халіп** выклікалі 19 лістапада ў пракуратуру Партызанскага раёну Менску з нагоды артыкулу ў расейскім часопісе «Новый очевидец» пра пасьлярэфэрэндумныя акцыі. Старшыню ПБНФ **Вінцука Вячорку** памежнікі затрымалі 19 лістапада на памежным пераходзе «Каменны Лог».

**АШ**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

## ВОДГУКІ

### «Эўрабачаньне» — дзіцячы фэст, а не стрып-шоў

Выступ беларускага хлопчыка на эўрафэсьце ў Нарвэгіі прадэманстраваў усю адсталасьць і бездапаможнасьць дзяржаўнай беларускай эстрады. Замест нармальнага шоў пабачыў замшэлыя ды ультраправінцыйныя мастацкія сродкі. Трэба яшчэ пашукаць краіну, дзе мастацтва пастаноўкі спынілася б на ўзроўні 1970-х. Між іншым, швэдзкія і нарвэскія газэты моцна раскрытыкавалі выступ беларускіх балерын, якія былі апранутыя ў супэркараценькія спадніцы. «Гэта ўсё ж такі дзіцячы фэст, а ня стрыпшоў», піша паважная «Aftonbladet» ды раіць арганізатарам кантраляваць этыку ўдзельнікаў.

Вядома ж, хацелі зьдзівіць сьвет, але выйшла, як заўсёды: нецікава і калгасна. Ізаляцыя б'е па ўсім.

**АК, Стакгольм**

### Пра хадэкаў

У заяве пра стварэньне ХДП асабіста мяне зьдзівіла, што маладыя людзі называюць сябе прадаўжальнікамі хрысьціянска-дэмакратычных рухаў 90-х, ні словам ня згадваючы пра Беларускую хрысьціянскую злучнасьць, якая дзейнічала ў 20—30-х гадах у Заходняй Беларусі. А гэта была буйная беларуская партыя, якая аб'яднала найлепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі і сьвятарства і імкнулася рэпрэзэнтаваць усе слаі народу. Партыя, якая выразна трымалася як найдалей ад камунізму і фашызму. Дый гістарычных асобаў, тытанаў беларушчыны, налічвала багата: А.Станкевіч, В.Гадлеўскі, Ф.Абрантовіч, К.Сваяк, Я.Пазьняк. Ніша БХЗ у нас пакуль не занятая. А тут праводзяцца няясныя паралелі з Рэспубліканскай партыяй у ЗША ды ХДС/ХСС у Нямеччыне.

**Алег Раявец, Менск**

### Фэстываль з граматычнай памылкай

Кінулася ў вочы афіша, якая запрашала на фінальнае шоў конкурсу жаночай прыгажосьці — «Діва Белай Русі». На афішы так і было напісана —«діва». З гэтай нагоды два пытаньні. Першае: наколькі можна даваряць кампэтэнтнасьці арганізатараў, калі іх адукацыя засталася на ўзроўні пачатковай школы? Другое: што наагул беларуская будзе ва ўсім гэтым дзействе? Хіба што Агуцін якраз і выручыць. Гэта калі хаця б 75% іґонага рэпэртуару будуць складаць песьні на беларускай мове. Во тады ўсе і ахнуць: ну й дзіва!

**Назіральнік**

## У злачынцы са школьнай лавы

У Воршы палепшылася статыстыка злачыннасьці сярод непаўналетніх. Зьнізілася колькасьць разбояў і хуліганстваў, праўда, павялічылася колькасьць рабаваньняў ды крадзяжоў. Значна больш затрымана падлеткаў у нецьвярозым стане ў грамадзкіх месцах. Зьвяртае на сябе ўвагу і той факт, што ўсё часьцей на злачынны шлях становяцца вучні сярэдніх школ. Спэцыялісты сьцьвярджаюць, што галоўнай прычынай падлеткавай злачыннасьці зьяўляецца іхняя незанятасьць. Так, у гарадзкім цэнтры занятасьці насельніцтва зарэгістравана 59 падлеткаў. Пры квоце 41 сёлета працаўладкавана ўсяго 22 непаўналетнія. Не дае надзеі на паляпшэньне і становішча ў сям’і. Сацыяльнымі сіротамі пры жывых бацьках сталі сёлета 89 дзетак.

## Рэкляма ёсьць, тавару няма

Зь нядаўняга часу ў аптэках Воршы зьявіліся асобныя вітрыны, у якіх выстаўлены лекі айчынных вытворцаў. Па выглядзе і рэцэптуры яны не зьмяняюцца дзесяцігодзьдзямі, а іх кошт звычайна меншы, чым у замежных аналягаў. Але здараецца, што гэтых танных лекаў у продажы якраз і няма. Не аднойчы быў сьведкам, як аптэкаркі казалі пакупнікам, што вітрыны зь беларускімі лекамі рэклямныя. На нездаволеныя пытаньні яны звычайна адказваюць, што вітрыны тыя загадала аформіць у кожнай аптэцы міністарка аховы здароўя краіны Людміла Пастаялка. Ёй, маўляў, і скардзьцеся або купляйце замежныя лекі, можа, і нягоршыя, але даражэйшыя.

**Яўген Жарнасек, Ворша**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У Лідзе, на тэрыторыі памежнага атраду, адчынілася новая праваслаўная царква. Асьвяціў яе мітрапаліт Філарэт. Пасьля цырымоніі ўладыка пасьвянціў новую салдацкую спартзалю і ўзнагародзіў старшыню Дзяржкамітэту памежных войскаў Аляксандра Паўлоўскага ордэнам сьвятога Ўладзімера — найвышэйшай царкоўнай узнагародай. Раней такі ордэн атрымаў Дзьмітры Паўлічэнка, і таксама за будаўніцтва царквы на тэрыторыі вайсковай часткі.**

## Нашы навіны

Жаўнерам і афіцэрам барысаўскіх вайсковых часьцей не рэкамэндавана глядзець праграмы тэлеканалаў ОРТ, РТР, НТВ. Дазволеныя толькі выпускі навін на БТ і АНТ.

**Зьміцер Панкавец, Барысаў**

## Павага да «Кола сяброў»

17 лістапада Магілёў зь неафіцыйным візытам наведаў пасол Францыі ў Беларусі Стэфан Шмялеўскі. Яго суправаджаў колішні пасол Германіі ў РБ Гельмут Фрык. Абодва яны, сярод іншага, сустрэліся зь сябрамі магілёўскага грамадзкага аб’яднаньня «Кола сяброў».

## Кніга Куркова й Пушкіна

Прэзэнтацыя кнігі гісторыкаў Ільлі Куркова і Ігара Пушкіна «Магілёўшчына: легенды, падзеі, людзі», выдадзенай тыражом 5400 экзэмпляраў, адбылася ў абласной бібліятэцы Магілёва. У зборнік уключаны нарысы па гісторыі Магілёўшчыны, напісаныя на аснове архіўных дакумэнтаў і літаратурных крыніц.

**Паводле Region.mogilev.by**

## Аднавіліся «Региональные ведомости»

Усяго 398 падпісчыкаў засталося ў прыватнай горацкай газэты «Региональные ведомости», выхад якой быў прыпынены Міністэрствам інфармацыі напярэдадні выбараў. На момант прыпыненьня тыраж газэты складаў 4000 экзэмпляраў, зь якіх 2200 распаўсюджваліся па падпісцы. Тыраж дзяржаўнага «Ленінскага шляху» за мінулы месяц вырас з 3600 да 4450 экзэмпляраў. Трохтысячны тыраж нумару «Региональных ведомостей», які выйшаў пасьля перапынку, раскуплены практычна цалкам.

## Сеюць дубровы

Горацкі лясгас зьвярнуўся да школьнікаў раёну з просьбай аб дапамозе ў зборы жалудоў у парку Беларускай сельгасакадэміі, дзе расьце нямала дубоў ва ўзросьце ад 100 да 300 год. Для аднаўленчых пасадак у месцах высечак на плошчы каля 8—9 га лясгас мае патрэбу ў 250 кг насеньня. Налета плянуецца правесьці лесапасадкі на плошчы пад 550 га. Прамысловае высяканьне дубу ў Беларусі забаронена, а дрэвы гэтай пароды выкарыстоўваюцца толькі як крыніца жалудоў для пашырэньня папуляцыі.

## Падзеньне цэнаў на яблыкі

Небывалы ўраджай яблыкаў у садах Горацкага раёну выклікаў рэзкае падзеньне цэн на іх. Прыватнікі, якія закуплялі ў канцы лета яблычны апад, давалі за кіляграм ня больш за 60—80 рублёў. Уладальнікі ж сартавых яблынь вымушаны былі прадаваць ураджай на рынку па 200—300 рублёў за кіляграм. У былыя гады сокаэкстрактны завод, што працаваў у Горках, прымаў у насельніцтва ня толькі яблыкі, але і іншыя плады, плацячы альбо грашыма, альбо прадукцыяй. Завод забакруціўся два гады таму.

**Эдуард Брокараў, Горкі**

## Сьфінкс? Лебедзь? Рысь!

На ўскрайку Гомелю, на ўезьдзе з боку Рэчыцы, паставілі скульптурнае ўвасабленьне сучаснага гарадзкога гербу. Вялікую, літую з чыгуну і ўкрытую бронзай рысь ужо пасьпелі ахрысьціць сьфінксам. Між тым эталён гербу, паводле якога манумэнт, уласна, і ствараўся, выклікае многа нараканьняў нават у заўзятых праціўнікаў рэканструяванай сымболікі Гомелю часоў ВКЛ. Эталёну закідаецца ня столькі геральдычная неахайнасьць, колькі пастава адлюстраванага на ім драпежніка: як паглянеш, дык рыхтык лебедзь нейкі.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

# Край самлелых вёсак

Вёска Вугольцы Докшыцкага раёну ляжыць на мяжы Бярэзінскага запаведніку. Калісьці яе перапаўняла жыцьцё, на палях раўлі «Кіраўцы», працавала манумэнтальна пабудаваная фэрма. Вакол вёскі — бары ды балоты. Зямля заўсёды была неўрадлівая, але цэнтралізаванае плянаваньне і хімізацыя давалі свой плён. Калгасны ўраджай звозілі полем да вёскі Чарніца. Нармальную дарогу (гравійку) праклалі ад Бярэзіна да Вугольцаў пяць год таму. Прыкладна ў той час шмат хто са старажылаў разьвітаўся з алюмініевым посудам, тым самым на сваім досьведзе пазнаўшыся з такой зьявай, як паляваньне на каляровыя мэталы. Жыцьцё напрыканцы веку навучыла, адыходзячы, замыкаць дзьверы.

Дарогу праклалі, а ездзіць ня стала каму. Цяпер у вёсцы ўвечары сьвеціцца акон пяць. Жыхары — адны пэнсіянэры. Два разы на тыдзень прыяжджае аўтакрама ды ў суседнюю вёску Чарніца — раз на тыдзень аўтобус. Калгасу даўно няма. Палі зарастаюць хмызьняком ды лесам, што насоўваецца з запаведных лясоў.

Баба Вольга, што жыве па-суседзтве зь сям’ёй Асіповічаў, дзе мы спыніліся, — адна з тых, хто застаецца ў вёсцы на зіму. Яна даволі жвавая і энэргічная для сваіх гадоў кабета (ёй восемдзесят). Яшчэ два месяцы таму яна трымала карову, якая ў яе ацялілася. Шкадуе, што не прадала жывёліны раней, бо праз сваю рагулю, якая дужа нэрвавалася пасьля родаў, старая страціла вока. Цяпер корміць двух парсюкоў, кошку, трымае агарод. Сумуе без малака ды просіць, каб сваякі ёй прывезьлі казу. Родныя яе клічуць у горад, ды не падабаецца там старой: увесь час гудуць машыны, а галоўнае — няма чаго рабіць, сумна… «Але ж і тут адзінока. Застануся адна, звалюся — ніхто не заўважыць», — са скрухай дадае бабулька.

Іншы жыхар Вугольцаў Анатоль Зялёнка дасканала ведае рыбныя схованкі ў рэках Бярэзіна, Чарніца, азёрах Медзазол, Межужол, самыя багатыя на журавіны балоты, грыбныя мясьціны. Ён ведае, дзе гняздуецца чорны бусел — рэдкая, занесеная ў Чырвоную кнігу птушка, якая да таго ж хаваецца ад людзей. Быў час, калі ён набіраў за восень да паўтоны журавін на продаж — гэтак карміў сям’ю. Ягоныя ягады каштавалі нават жыхары Масквы, сьвята верачы, што гэткія палымяна-чырвоныя, памерам зь вішню журавіны растуць пад Ноўгарадам. Баяцца масквічы браць беларускае, хаця радыялягічны кантроль паказвае надзіва нізкі фон лясных дароў.

Анатоль да таго ж — выдатны вынаходнік-тэхнар. З рухавіка перасоўнай мініэлектрастанцыі, карбюратара ад матацыкла, дэталяў ад трактара ён змайстарваў адмысловы цягач, які калісьці разганяўся да 50 км/г. Незаменны памочнік у гаспадарцы вылучаецца надзвычайнай праходнасьцю і непатрабавальнасьцю. Калі суседу становіцца шкада выводзіць у поле ў летнюю сьпёку на пакусаньне сьлепняў адзінага ў вёсцы каня, ён просіць у Анатоля жалезнага.

Канец кастрычніка. Сёлета позьняя восень, як была позьняй і вясна. У лесе эра зялёнак ды падзялёнак. Зрэдку дзе-нідзе трапляюць лісічкі, рыжыкі, апенькі, падмарожаныя баравікі — рэшткі былой раскошы. Зьвяроў нідзе не відаць і не чуваць. Кажуць, што дужа паменшылася колькасьць самцоў-ласёў, бо ў замежных турыстаў папулярнасьцю карыстаецца афіцыйна дазволенае паляваньне на іх дзеля трафэйных рогаў. Вяскоўцы бачылі, як у вёску ў пошуках свайго каханьня заблукала ласіха і з сумам паглядала на прывязанага ў загарадцы каня… Дзікоў у ваколіцах яшчэ хапае. Удзень яны хаваюцца на балоце. Затое ўначы робяць вылазкі на палі. Бярэцца на мароз...

**Арцём Лява, Докшыцы.**
**Фота аўтара**

## Тэатры

**Балет**
**26** (пт) — «Легенда аб Уленшпігелю».
**28** (ндз) — «Лебядзінае возера».
**30** (аўт) — «Эсмэральда».

**Опэра**
**25** (чц) — «Іялянта».
**27** (сб) — «Трубадур».

**Тэатар імя Янкі Купалы**
**25** (чц) — «Ідылія».
**26** (пт) — «Памінальная малітва».
**27** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**28** (ндз) — «СВ».
**28** (ндз) — «Паўлінка».
**Малая сцэна**
**28** (ндз) — «Баляда пра каханьне».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**27** (сб) — «Адэль».
**26** (пт), — «Адвечная песьня».
**30** (аўт) — «Песьні ваўка».
**28** (ндз) — «Понцій Пілят».

**Тэатар-студыя кінаактора**
**25** (чц) — «Назаўсёды ў памяці».

**Тэатар імя Горкага**
**25** (чц) — «Перад захадам сонца».
**26** (пт) — «Паведамленьне Марыі».
**27** (сб) — «Дэтэктар хлусьні».
**28** (ндз) — «Вольны шлюб».
**30** (аўт) — «Суцяшальнік удоў».

**Моладзевы тэатар**
**25** (чц) — «Бажавольная выстава» («Сказ пра Гуску...»).
**26** (пт) — «Пігмаліён».
**27** (сб) — «Акадэмія сьмеху».
**28** (ндз) — «Позьняе каханьне».

**«Дзе-я»**
**25** (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».
**26** (пт) — «Жанчыне не забароніш...».

**Тэатар эстрады**
**25** (чц) — майстэрня эстраднага танцу Л. і А.Яфрэмавых прадстаўляе новы вакальна-харэаграфічны праект «Белы голуб».
**26** (пт) — шоў «Эстрадны кактэйль».

**Клюб імя Дзяржынскага**
**25** (чц) — «Вячэра з дурнем».

## Канцэрты

**Ігар Губэрман**
**25 лістапада** ў к/з «Менск» адбудзецца канцэрт Ігара Губэрмана. Пачатак а 19-й.

**«Джазавы шквал»**
**26 лістапада** ў памяшканьні Тэатру юнага гледача адбудзецца канцэрт джазавага піяніста Ігара Брыля з праграмай «Джазавы шквал».

**«Віртуозы Масквы»**
**3 сьнежня** ў Доме афіцэраў адбудзецца канцэрт «Віртуозаў Масквы». Пачатак а 19-й гадзіне.

## Выставы

**«Сьвет мэталу»**
**З 30 лістапада да 3 сьнежня** ў выставачным павільёне на вул.Я.Купалы, 27 адбудзецца Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Сьвет мэталу-2004».

**«Белпрадукт» і «Упакоўка»**
**З 30 лістапада да 3 сьнежня** ў выставачным павільёне на пр.Машэрава, 14 адбудзецца XXII Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Белпрадукт-2004», а таксама VI Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Упакоўка і этыкетка-2004».

**З клясыкі беларускага мастацтва**
**Да 11 сьнежня** ў мастацкай галерэі «ЛяСандр-Арт» (вул.Раманаўская Слабада, 24) працуе выстава «З клясыкі беларускага мастацтва». На ёй можна ўбачыць творы майстроў рэалістычнага жывапісу 2-й паловы XX ст.

**«Фарбы зямлі»**
У галерэі «Славутыя майстры» (Камунальная набярэжная, 6) **да 1 сьнежня** працуе выстава керамікі «Фарбы зямлі».

**«Artfolio»**
**Да 20 сьнежня** ў «М-Галерэі» Інстытуту імя Гётэ (вул. Фрунзэ, 5) працуе выстава графікі «Artfolio». Выстава пазнаёміць гледачоў з працамі У.Савіча, В.Славука, У.Вішнеўскага, В.Сідарава, Ю. Хілько, Т.Сіплевіч і А.Савіча.

**Мастакі эўрапейскіх краін і «Дыялёгі»**
**Да 2 сьнежня** ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Ф.Скарыны, 47) міжнародная гільдыя жывапісу прадстаўляе творы мастакоў эўрапейскіх краін, а **8 сьнежня** скончае працу выстава твораў Натальлі Рачкоўскай і Міхаіла Сенькіна «Дыялёгі».

**«Трыццаць тры...»**
У мастацкай галерэі «Вільнюс» **да 10 сьнежня** працуе выстава прац Андрэя Бондарава «Трыццаць тры...» — прысьвячэньне Полацку.

**Тэхна-арт**
У мастацкай галерэі «Унівэрсытэт культуры» (Палац Рэспублікі) **да 8 сьнежня** працуе выстава «Тэхна-арт». Кампутарная графіка і дызайн, аб'екты. Тэхнаарт — гэта ня толькі лічбавыя фотакалажы, але і інтэрактыўныя формы. Свае працы прадстаўляюць і маладыя, і вядомыя аўтары — В.Качан, С.Ждановіч, А.Брылка, А.Табокіч, А.Савіцкі, Д.Карніенка і інш. Уваход вольны.

**Стыль мадэрн у Латвіі**
У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі **да 9 сьнежня** экспануецца выстава «Стыль мадэрн у Латвіі», прысьвечаная стылю мадэрн у архітэктуры Рыгі, Ліепаі і Юрмалы.

**Выстава лялек**
**Да 5 сьнежня** ў памяшканьні мастацкай галерэі Менскага абласнога цэнтру народнай творчасьці (Гікала, 4) працуе выстава лялек. Можна ўбачыць лялькі майстроў-лялечнікаў Беларускага саюзу майстроў народнай творчасьці, Беларускага саюзу дызайнэраў, а таксама вольных «лялечнікаў». Цэнтар гульні і цацкі паказвае батлейку. Дарослыя могуць паглядзець фільм пра францускія лялькі, а дзеці — мультфільмы.

**Фларыян Ждановіч**
У дзяржаўным музэі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (Музычны зав., 5) **да 31 сьнежня** працуе выстава, прысьвечаная 120-годзьдзю беларускага тэатральнага дзеяча Фларыяна Ждановіча.

**Праз 90 гадоў і лінію фронта**
У Музэі гісторыі і культуры Беларусі **да 1 сьнежня** працуе выстава «Праз 90 гадоў і лінію фронту. Першая сусьветная вайна ў Беларусі». На ёй можна ўбачыць фатаздымкі часоў Першай сусьветнай.

## Клюбнае жыцьцё

**Акварыюм** (232–48–75)
**27** (сб), 19.00 — вечар блюзу, прысьвечаны дню народзінаў Джымі Хендрыкса. Граюць гурты «Mojo Blues», «Нестар Бэнд», «STNTB».

**Белая Вежа** (284–69–22)
**25** (чц), 24.00 — «White Tower Party»: dj Grizzly, dj Top, dj Dee.
**26** (пт), 22.00 — dj Міхель.
**27** (сб), 22.00 — dj Міхель.
**28** (ндз), 22.00 — dj Alex.

**Бліндаж** (219–00–10)
**25** (чц), 23.00 — dj Egor.
**26** (пт), 23.00 — dj Egor.
**27** (сб), 23.00 — «Berlin—Minsk»: dj Санчас.
**28** (ндз), 23.00 — dj Egor.

**Bronx** (288–10–61, Velcom: 103, 105)
**25** (чц), 22.00 — «A Cup of Acid Jazz»: dj Komotsky (Масква).
**26** (пт), 22.00 — жывая музыка.
**27** (сб), 23.00 — «R'N'B the Party».

**Гудвін** (226–13–06, 626–13–03)
**25** (чц), 20.00 — жывая музыка: «N.C.»; «City Groove».
**26** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**27** (сб), 21.00 — жывая музыка.

**Графіці** (266–01–54, 671–58–65)
**30** (аўт), 20.00 — «Найлепшае» фольк-гурту «Палац».

**Лео** (668–58–21, 702–08–32)
**26** (пт), 19.00 — супольны канцэрт беларускіх моладзевых каманд «У падтрымку парку Чалюскінцаў!». Ліцэісты («Веру ў цябе»), «Індыга» і іншыя беларускія VIP-каманды. Квіткі: 4000—5000.

**Рэактар** (671–58–65)
**3** (пт), 18.30 — канцэрт гурту «Джа Дывіжн» (Масква) пры ўдзеле групы «Вірус Ліха».

**X-Ray** (223–93–55)
**26** (пт), 22.00 — dj Noche.
**27** (сб), 22.00 — dj Top.

## Менская кінаафіша з 26 да 28 лістапада

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Белыя цыпачкі»: **26** (пт) 16.50, 19.10, 21.20; **27, 28** (сб, ндз) 14.30, 16.50, 19.10, 21.20.
«Весьягонская ваўчыца»: **26—28** (пт—ндз) 18.50, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Два нулі»: **26** (пт) 17.00 (іл, пд), 21.00 (пд); **27, 28** (сб, ндз) 13.00, 15.00, 17.00, 21.00 (пд).
«Наталі»***: **26—28** (пт—ндз) 18.50.

**«Дружба»** (240-90-13)
«Пярэпалах у інтэрнэце»: **26** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **27** (сб) 18.00, 20.00; **28** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
Фільм-прызэр МКФ «Лістапад»: **26** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Уімблдон» (прэм'ера): **27** (сб) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00 (прэзэнтацыя фільму); **28** (ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Эфэкт матылька»***: **26** (пт) 16.30 (пд), 18.40 (пд), 21.00 (пд); **27, 28** (сб, ндз) 16.30 (пд).
«Уімблдон» (прэм'ера): **27, 28** (сб, ндз) 14.30 (іл), 19.00 (пд), 21.00 (пд).

**«Мір»** (284-37-71)
«Два нулі»: **26—28** (пт—ндз) 17.20, 19.10, 21.00.
«Пярэпалах у інтэрнаце»: **26—28** (пт—ндз) 16.40, 20.20.
«Адкрытае мора»***: **26** (пт) 18.30; **27** (сб) 15.00, 18.30; **28** (ндз) 15.00 (іл), 18.30.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Два нулі»: **26** (пт) 15.00, 17.00, 19.00, 21.10; **27, 28** (сб, ндз) 14.30, 16.30 (іл), 19.00, 21.10.

**«Піянер»** (227-64-87)
«Нябесны капітан і Сьвет будучыні»: **26** (пт) 19.00; **27, 28** (сб, ндз) 15.00, 19.00.
«Эўратур»***: **26—28** (пт—ндз) 17.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Белыя цыпачкі»: **26** (пт) 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00; **27, 28** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пд) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Для дзяцей

**Тэатар юнага гледача**
**27** (сб), 11.00, 14.00 — «Сястра мая Русалачка».
**28** (ндз), 11.00 — «Залатое сэрцайка».
**28** (ндз), 16.00 — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**30** (аўт), **1** (ср), 18.00 — «Тарас на Парнасе».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**27** (сб) — «Хрустальны туфлік».
**28** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».

**«Беларускія сэзоны»**
**27** (сб) — «Сьнежная каралева».

**Опэра**
**28** (ндз) — «Горад майстроў».

**Новы драматычны тэатар**
**27** (сб) — «Новыя прыгоды старых знаёмых».

**Тэатар эстрады**
**27** (сб) — шоў лялек «Клоўны і лялькі».
**28** (ндз) — дзіцячая праграма «Уся справа ў капелюшы!».

**Юнаму гледачу**
**«Аўрора»**
«Дунечка»: **26** (пт) 14.30; **27, 28** (сб, ндз) 13.30, 16.30.
**«Берасьце»**
«У сузор'і Быка»: **26** (пт) 15.00.
«Атлянтыда: згубленая імпэрыя»: **27, 28** (сб, ндз) 11.00.
**«Дружба»**
«Два браты»: **26** (пт) 12.00; **27, 28** (ндз) 11.00.
«Полі»: **26** (пт) 14.00; **27, 28** (сб, ндз) 13.00.
**«Мір»**
«Чароўны востраў»: **27, 28** (сб, ндз) 13.00.
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **27, 28** (сб, ндз) 14.00.
**«Піянер»**
«Шрэк-2»: **26—28** (пт—ндз) 11.00.
«Спартак і Калашнікаў»: **26** (пт) 14.00; **27, 28** (сб, ндз) 13.00.

# «Веру ў Ліцэй!»: спроба №3

26 лістапада навучэнцы Беларускага ліцэю ў чарговы раз робяць спробу наладзіць прэзэнтацыю свайго музычнага праекту «Веру ў цябе!». Сёлета канцэрт ліцэістаў пераносіўся, забараняўся, адмяняўся, таму ўжывую песьні з кружэлкі маглі пачуць толькі польскія мэляманы — зь месяц таму ліцэісты давалі турнэ па суседняй краіне.

Мэнэджэр праекту Франак Вячорка выказвае спадзеў, што менская прэзэнтацыя ўсё ж адбудзецца. Афішы зробленыя, квіткі прадаюцца.

За час «забаронаў і адменаў» ліцэісты зрабілі яшчэ некалькі песень, сярод іх «Сьвята па імені ТЫ», якая, на іх думку, можа пакарыць беларускі FM-этэр.

У канцэрце возмуць удзел і сталыя музыкі з групы «Індыга». 26 лістапада а 19.00 у клюбе «Лео» (пр.Скарыны, 84а, район парку Чалюскінцаў).

**СБ**






КІНО Ў МЕНСКУ

# Гульні зь мінулым небясьпечныя для здароўя

Эван зь дзяцінства пакутаваў на правалы памяці. Калі ўжо ў сталым веку ён паспрабаваў высьветліць, што зь ім здаралася, калі зьнікала сьвядомасьць, то пачаліся трывожныя й небясьпечныя неприемнасьці. Эван знаходзіць стары дзёньнік, які дазваляе яму вандраваць у мінулае. Але з кожным разам спробы выправіць лёс прыводзяць да цяжэйшых наступстваў.

Фантасты даўно папярэджвалі, што гульні з часам небясьпечныя для здароўя, а ў апавяданьні Рэя Брэдбэры забіты ў мінулым матылёк зьмяняў вынікі прэзыдэнцкіх выбараў. Аўтары Эрык Брэс і Дж.Мэкі Грубэр, якія доўга не маглі прадаць свой закручаны сцэнар, прапанавалі свой арыгінальны варыянт вандровак у часе. Галоўны герой перамяшчаецца ў сваё цела ў мінулым — цела дзіцяці, а галоўная машына часу — наша памяць.

Дзіцяці з дарослай сьвядомасьцю прыходзіцца змагацца з пэдафілам, выратоўваць спаленага сабаку й папярэджваць выбухі, але ўсе раны й гузакі ад гэтага атрымае вандроўнік-дарослы.

Для Эштана Катчэра, які здымаўся ў дурнаватай карціне «Дзе мая тачка, чувак?», гэта найлепшая роля ў кар'еры. Напалоханы, з прыпухлымі губамі, ён ідэальная ахвяра й творца лёсу. Самых высокіх слоў заслугоўвае Эмі Смарт, якая ў розных «жыцьцях» то прыгнечаная афіцыянтка, то расьпешчаная дзяўчо, то пракураная прастытутка.

Ліхаманкавыя правалы ў памяці палохаюць, рэжысура разьлічаная й прафэсійная, а мантаж трапны.

Гэтае годнае камэрцыйнае кіно прапануе суцяшальны й асьцярожны фінал для разгубленых япі. Але небясьпечныя гульні зь лёсам апраўдваюць абачлівыя высновы.




«Эфэкт матылька» («Butterfly Effect») ЗША, 2004, каляровы, 113 хв.
**Жанр:** фантастычны трылер.
**Адзнака:** 6,5 (з 10).

Карціна «Эфэкт матылька» ўжо засьвяцілася ў кінафармацe «4х4», да таго ж яна няблага разыходзіцца на DVD. Цяпер гэты фантастычны трылер даступны ў шырокім менскім кінапракаце.

**Андрэй Расінскі**

# Народы Расеі

Аляксандар Надсан

У 1951 годзе ў Заходняй Эўропе было шэсьць беларускіх каталіцкіх сьвятароў. Зь іх да ўсходняга (бізантыйскага) абраду належалі чатыры: Чэслаў Сіповіч у Англіі, Леў Гарошка ў Францыі, Міхась Маскалік у Паўночнай і Ўладзімер Салавей у Паўднёвай Нямеччыне; а да рымскага (лацінскага) абраду — двое: Пётра Татарыновіч у Рыме і Францішак Чарняўскі ў Францыі. У Рыме вучыліся таксама два клерыкі (сэмінарысты). На жаль, ніхто не адказваў за ўсю пастырскую працу сярод беларусаў і не каардынаваў дзейнасьці паасобных сьвятароў. Гэтае пытаньне закранався на першым тыдні студыяў Беларускага акадэмічнага каталіцкага аб'яднаньня «Рунь», што адбыўся 16—21 ліпеня 1951 году ў бэнэдыктынскім кляштары ў Шэвэтоні ў Бэльгіі. На тыдні прысутнічалі тры сьвятары: Чэслаў Сіповіч, Леў Гарошка і Міхась Маскалік, — а таксама біскуп Баляслаў Слоскан (Слосканс), апостальскі адміністратар Менскі і Магілёўскі, які жыў тады на выгнаньні ў Бэльгіі, латыш паводле нацыянальнасьці, паходзіў з Латгаліі, дзе жыло мяшанае беларуска-латыскае насельніцтва. Казалі, што ягоная маці была беларускай.

На тыдні студыяў прысутныя там сьвятары зьвярнуліся да Слоскана з просьбай стаць апостальскім візытатарам для беларусаў. […]

Слоскан хоць і ня выказаў вялікага энтузіязму, але й не адмовіўся. Таму беларускія сьвятары пастанавілі прасіць Сьвятога Айца прызначыць яго апостальскім візытатарам для беларусаў-каталікоў абодвух абрадаў. Гэта яны зрабілі ў лісьце за 11 верасьня 1951 году. Каб не дзяліцца пры малым ліку сьвятароў і вернікаў, яны прасілі аднаго візытатара для ўсіх, а ня двух — для «ўсходнікаў» і «лаціньнікаў». Дарэчы, той самай думкі трымалася Ўсходняя Кангрэгацыя. […]

25 сакавіка 1952 году ў Лювэне адбылася ўрачыстасьць — пасьвячэньне новага беларускага студэнцкага дому. Каб выканаць пасьвячэньне, адмыслова прыехаў з Рыму кардынал Тысэран. Прысутныя на ўрачыстасьці айцы Сіповіч, Гарошка і Чарняўскі пастанавілі скарыстаць з нагоды і зноў паспрабаваць зрушыць справу з апостальскім візытатарам. […]

Праз два з паловаю месяцы беларускія сьвятары атрымалі ад біскупа Слоскана лісты з датаю 13 чэрвеня 1952 году з паведамленьнем, што «Сьвяты Айцец назначыў мяне Апостальскім Візытатарам для беларусаў і рускіх усходняга абраду ў краінах Заходняй Эўропы за выняткам Італіі». Слоскан прасіў не распаўсюджваць гэтай весткі, пакуль не атрымае з Рыму інструкцыяў адносна ягонай кампэтэнцыі.

Беларускія сьвятары былі ня тое нават слова што расчараваныя і прыгнобленыя. Яны атрымалі ўсё, чаго баяліся: беларусаў-«усходнікаў» укінулі зноў у адзін кацёл з расейцамі, аддзяліўшы ад іх перш «лаціньнікаў».

Як быццам гэтага мала, 5 ліпеня 1952 году, у дзень сьвятых апосталаў славянаў Кірылы і Мятода ў рымскім календары, выйшаў у сьвет «Апостальскі Ліст да ўсіх народаў Расеі» Папы Пія XII. У лісьце Папа пасьвяціў «народы Расеі» бязьвіннаму сэрцу Марыі, Маці Божай. Вось ягоныя словы: «Падобна як некалькі гадоў таму мы пасьвяцілі Бязьвіннаму Сэрцу Багародзіцы Дзевы ўвесь людзкі род, так цяпер у асаблівы спосаб пасьвячаем і аддаём пад апеку Ейнаму Бязьвіннаму Сэрцу ўсе народы Расеі».

Ліст прывёў беларусаў і ўкраінцаў у шок. Не таму, што Папа аддаў Расею пад апеку Маці Божае, а таму, што ён карыстаўся падазронай палітычнай тэрміналёгіяй. Сапраўды, фраза «народы Расеі» вельмі ж нагадвала старую формулу «Вялікая, Малая і Белая Русь», такую дарагую расейскім імпэрыялістам усіх колераў, якія не прызнавалі беларусаў і ўкраінцаў за асобныя нацыі і адмаўлялі ім у праве на незалежнае існаваньне. Цяпер выглядала, што яны мелі падтрымку з боку Галавы Каталіцкай Царквы. Прынамсі, так зразумела Апостальскі ліст расейская эміграцыйная прэса і, доўга не чакаючы, аднадушна яго ўхваліла. У Рыме ў сьпешным парадку выйшаў вялікім накладам расейскі пераклад ліста.

Рэакцыя беларусаў і ўкраінцаў на ліст «да народаў Расеі» вагалася ад разгубленасьці да абурэньня. Беларускія каталіцкія сьвятары апынуліся ў цяжкім становішчы: застаючыся вернымі сынамі Каталіцкай Царквы, яны не маглі маўчаць, калі дзеялася крыўда іхнаму народу. Аднак цалкам значэньне папскага дакумэнту яны ўсьвядомілі не адразу.

20—27 ліпеня 1952 году ў Лёндане адбыўся другі тыдзень студыяў БАКА «Рунь». Прысутныя на ім сьвятары скарысталі з нагоды, каб супольна абмеркаваць стан рэчаў, які склаўся пасьля прызначэньня Слоскана візытатарам для беларусаў і расейцаў. Супольна яны выпрацавалі праект ліста да Сьвятога Айца. Напісаць канчатковы варыянт даручылі айцу Сіповічу. 8 верасьня ліст быў гатовы. Падпісалі яго, перасылаючы адзін аднаму па пошце, айцы Гарошка, Сіповіч, Маскалік, Татарыновіч, Чарняўскі і апякун беларускіх студэнтаў у Лювэне Рабэрт ван Каўвэлаэрт. Апошнім атрымаў ліст айцец Татарыновіч у Рыме. Падпісаўшы, ён занёс яго ў Ватыканскі дзяржаўны сакратарыят. Беларускія сьвятары прасілі Сьвятога Айца пашырыць паўнамоцтвы апостальскага візытатара на вернікаў рымскага (лацінскага) абраду, «расьцярушаных па ўсім сьвеце і ў большыні выпадкаў пазбаўленых духоўнай апекі». […]

У сваім звароце да Папы беларускія сьвятары не краналі — хіба толькі ўскосна — справу ліста «да народаў Расеі», пра які айцец Сіповіч у лісьце да айца Татарыновіча за 16 верасьня 1952 году выказаўся, што «больш чагосьці няўдалага на працягу ўсіх пантыфікатаў апошніх 50-ці гадоў цяжка знайсьці». […]

Дарэчы, айцец Гарошка, відаць, разгубіўшыся і добра не падумаўшы, падаў у «Божым шляхам» кароткую вестку пад назовам «Ліст Сьвяцейшага Айца Пія XII да расейскага народу», у якой было сказана, што «Сьвяцейшы Айцец пасьвячае расейскі народ непарочнаму Сэрцу Дзевы Марыі». (Божым шляхам. Ліпень—жнівень 1952. №49. С. 14.) Гэта не зусім адпавядала праўдзе, бо ў папскім дакумэнце гутарка ішла не пра «расейскі народ», а пра «народы Расеі». Гэта зазначыў айцу Гарошку айцец Сіповіч у лісьце за 9 кастрычніка: «Калі ідзе аб ліст Сьв.Айца — дык тут трудна спрачацца. «Украінцы пішуць супроць, а чаму вы маўчыцё?». Я бачыў у «L'Osservatore Romano», што ў «Civilta Cattolica» ёсьць артыкул а.Германа, які бароніць пазыцыі Ватыкану. Я жадаў бы мець гэты нумар… Я ня ведаю, але магчыма, што трэба было б напісаць у «Божым шляхам» штосьці спакойнага яшчэ раз, але называючы справу па імені. Гэта нядобра, што ты напісаў у апошнім нумары «Б.шл.»: «Ліст… да расейскага народу». Гэта няпраўда. Толькі трэба напісаць вельмі спакойна ў Сакратарыят стану, я думаю, няхай напіша кожны з нас асобна».

Так і зрабілі. Айцец Гарошка напісаў ад свайго імя пратэст 25 лістапада 1952 году і паслаў яго найпрост Сьвятому Айцу, а копію — ва Ўсходнюю Кангрэгацыю. Вось некалькі ўрыўкаў з гэтага ліста: «Мінула ўжо чатыры месяцы ад выхаду Вашага ліста «Sacro vergente anno» да народаў Расеі… Беларусы (аднолькава каталікі і праваслаўныя) адчулі сябе балюча закранутымі, убачыўшы сябе залічанымі да расейскіх народаў. У сапраўднасьці расейцы для беларусаў зьяўляюцца найбольшымі прыгнятальнікамі; таму зразумела, што ім невыносна насіць імя сваіх прыгнятальнікаў… Я хацеў бы сказаць Вам больш ясна, чаму фраза «народы Расеі»… зрабіла такое ўражаньне сярод беларускай эміграцыі. Трэба зазначыць, што якраз гэтай фразай маніпулююць расейскія імпэрыялісты, якія хочуць захаваць уладу над народамі, паняволенымі праз СССР… Беларускія вернікі ўважаюць Вашую Сьвятасьць бацькам усіх народаў. Беларусы ўпэўненыя, што, як бацька



АЛЕСЬ ТРАФІМЕНКА

сям'і называе кажнае са сваіх дзетак па імю, так і Ваша Сьвятасьць, зьвяртаючыся да беларускага народу, будзе ўжываць сапраўднае імя гэтага народу… Я прашу Вашую Сьвятасьць знайсьці спосаб направіць шкоду, зробленую лістом «да народаў Расеі» сярод беларускай эміграцыі. Можна было б скарыстаць з гэтай нагоды, каб назначыць Апостальскага Візытатара для адных толькі беларускіх эмігрантаў каталікоў абодвух абрадаў… і сказаць пры гэтай нагодзе эмігрантам некалькі слоў». Гэтыя моцныя, хоць ня вельмі дыпляматычныя, словы, відаць, трапілі ў мішэнь, бо 15 сьнежня Гарошка атрымаў вострый ліст ад сакратара Ўсходняй Кангрэгацыі кардынала Тысэрана, у якім той пісаў: «Не ўважаючы патрэбным увmasходзіць у сутнасьць такой просьбы, лічу маім абавязкам даць вам зразумець, што кожны раз, калі вы жадаеце данесьці нешта да ведама Сьвятога Айца, будзе добра рабіць гэта звычайнай дарогай, менавіта праз гэтую Сьв.Кангрэгацыю, якая, мажліва, прадставіць справу Высокаму Пантыфіку, дапаўняючы яе іншымі заўвагамі паводле свайго ўзгляду».

Айцец Сіповіч выказаў сваю думку пра папскі ліст «да народаў Расеі» ў лісьце за 6 сьнежня 1952 году ня проста Сьвятому Айцу, але апостальскаму дэлегату ў Англіі, просячы выкарыстаць яго так, як уважае найлепш. Да свайго ліста ён дадаў тэксты адпаведных артыкулаў зь беларускае прэсы. Ён апісаў таксама рэакцыю беларусаў у Англіі: «Пасьля выхаду ў сьвет Апостальскага ліста да народаў Расеі дзьверы дамоў многіх праваслаўных братоў былі зачыненыя для каталіцкага сьвятара. У Манчэстэры беларуская грамада не хацела нават сустрэцца са мною; некаторыя сябры Згуртаваньня беларусаў (сябрам якога я таксама зьяўляюся) напісалі зьняважлівыя лісты супраць Каталіцкай Царквы, Папы і супраць мяне… У Брадфардзе… са злосьцю і сарказмам паказвалі мне ліст Папы «да народаў Расеі», паўтараючы ўсьцяж пра крыўду, зробленую беларускаму народу… Тое самае адчуваецца і ў Лёндане… Ніводзін праваслаўны не прыходзіць больш у маю капліцу на Голдэн-авэню. Каталікі, разгубленыя, ня кажуць нічога зьняважлівага супраць Сьвятой Царквы, але чуючца прыбітымі лістом Сьвятога Айца».

На думку Сіповіча, незадаволенасьць перадусім выклікалі: неадпаведная перастарэлая тэрміналёгія; гістарычная няпраўда; рэакцыя расейцаў, якія зразумелі ліст Папы як ухваленьне іхных палітычных поглядаў; і камэнтары ў афіцыйным Ватыканскім органе «L'Osservatore Romano», якія яшчэ больш заблытвалі і без таго складаную сытуацыю.

Канчатковыя высновы айца Сіповіча ўяўляюць немалую цікавасьць. Спасылаўшыся на артыкул з «L'Osservatore Romano» за 3 жніўня 1952 году, у якім гаворыцца пра «Ліст да народаў Расеі» як пра «адну з найбольш выдатных падзеяў у Царкве і ва ўсім Хрысьціянскім сьвеце», ён працягвае: «Мне балюча сказаць, што тыя, да каго гэты ліст быў зьвернуты, думаюць інакш. Усе беларускія і ўкраінскія часопісы прызнаюць вялікі аўтарытэт Папы, але адначасова выказваюць сваё расчараваньне гэтым дакумэнтам, які мусіў стацца паваротным пунктам у рэлігійнай скіраванасьці славянаў. Маё сьвятарскае сумленьне змушае мяне сказаць, што, на маю думку, ліст «да народаў Расеі» праз доўгія гады для 30 мільёнаў украінцаў і 10 мільёнаў беларусаў будзе найбольшай перашкодай на шляху да еднасьці з Рымскім Пасадам. Гэта вельмі балюча для нас, сьвятароў, нягодных, але верных слуг, Сьвятое Царквы, якая дала нам уладу працаваць для збаўленьня душаў».

Айцец Сіповіч даў, мабыць, найбольш шырокую і глыбокую ацэнку папскага дакумэнту. Ён выходзіў зь меркаваньняў пастырскага

## з новай кнігі а.Аляксандра Надсана пра біскупа Чэслава Сіповіча

Ці ж Багародзіца ведае толькі Расею, а ня ведае ані Беларусі, ані Ўкраіны?



**Айцец Часлаў Сіповіч**

парадку і справядлівасьці для свайго народу. Яму прыйшлося нялёгка, бо ў той час усякая крытыка Папы, асабліва з боку параўнаўча маладога і невядомага сьвятара, лічылася нечуванай сьмеласьцю. Каб «застрахавацца» ад магчымых абвінавачаньняў у нелаяльнасьці, у канцы ліста ён дадаў на лацінскай мове дэкларацыю вернасьці Сьвятой Царкве і Наступніку Сьвятога Пятра.

Біскуп Слоскан быў вельмі незадаволены крытыкаю папскай энцыклікі «да народаў Расеі». Ён ня бачыў нічога дрэннага ў тым, што яго прызначылі для беларусаў і расейцаў, і не разумеў крытыкі ліста «Да народаў Расеі»: «Вы пішаце аб уражаньні, якое выклікала пасланьне Сьв.Айца. Я чытаў гэтае ўражаньне ў «Бацькаўшчыне» і «Беларускай трыбуне». Гэтыя людзі ніколі не зразумеюць Царквы як Валадарства Божага… Усе гэтыя закіды Сьв.Айцу ёсьць вынік нянавісьці да расейскага народу, і ўся іх фармуліроўка сьведчыць аб гэтай нянавісьці… Першай віноўніцай гэтага пасланьня ёсьць Царыца Нябесная, Прабагаслаўлёная Маці Божая Марыя. У сваім зьяўленьні ў Фаціме ў 1917 годзе яна абяцала, што калі веруючых будуць маліцца, дык Расея se convertira [навернецца. — **А.Н.**]. Але ў сваім зьяўленьні Богамаці не адкрыла: а) што Яна разумее пад словам Расея, б) як трэба разумець слова se convertira… Маці Божая паставіла нібы ўмову навярненьня Расеі — яе пасьвячэньне непарочнаму сэрцу Марыі… Адтуль выйшла пастанова пасьвячэньня Расеі сэрцу Багамаці. І Сьв.Айцец не інакш бярэ пасьв(ячэньне), як у тым сэнсе, у якім яго бярэ Прачыстая, — а нам, грэшным, ня трэба знаць усе тайны Божай Маці». Слоскан скончае свой ліст словамі: «Прыйшла пара мне пачаць сваёй грудзьдзю бараніць Сьв.Айца, калі ўкраінцы і беларусы пачалі кампрамэтаваць намесьніка Хрыста на радасьць цёмным сілам».

Айцец Гарошка адказаў 8 сьнежня: «Ужо сам факт, што, падаючы аб Вашай намінацыі, нельга падаць да агульнага ведама даслоўнага тэксту намінацыйнага дэкрэту, гаворыць аб тым, што з гэтаю намінацыяю ня ўсё ў парадку, і гэта неабходна выясьніць якраз людзям, якія той дэкрэт падпісалі… Выказваць кардыналам і асабліва Сьвяц. Айцу ўсё тое, што нам баліць, ёсьць нашым абавязкам. Да каго ж нам зьвяртацца з нашымі рэлігійнымі клопатамі, як не да яго?.. Гісторыя паўстаньня ліста «да народаў Расеі» ведамая, але бяда ў тым, што якраз у гэтую гісторыю расейскі імпэрыялізм усадзіў свае тры грошы, бо зусім іншая справа «Расея» ў фацімскім аб'яўленьні, а іншая справа «народы Расеі». На маю думку, няма нічога больш небясьпечнага, як калі някдобрыя людзкія думкі прыкрываюцца аўтарытэтам сьвятасьці, у даным выпадку аўтарытэтам Багародзіцы і Сьвяц. Айца. А дзе ж у якім аб'яўленьні Багародзіца карысталася двузначнаю палітычнаю тэрміналёгіяю? Ці ж Багародзіца ведае толькі Расею, а ня ведае ані Беларусі, ані Ўкраіны?.. Зрэштаю, для нікога ня ёсьць сакрэтам, што пасланьне ўкладаў рэктар «Русікуму», а.Вэтэр, і не паводле фацімскага аб'яўленьня, але паводле таго духу, які пануе ў гэтай установе… Аб тым, што хацелі правесьці расейскія прыслужнікі праз успомненае пасланьне, можна бачыць зь іхнае прэсы і камэнтароў, а яны маюць найвыразьней палітычную афарбоўку… Што да вашае апошняе заўвагі, быццам беларусы і ўкраінцы пачалі кампрамэтаваць намесьніка Хрыста, дык тут трэба прызнаць хіба нейкае вялікае непаразуменьне, бо ж лісты, рапарты і нават пратэсты, якія ідуць у Рым у зьвязку з тым пасланьнем, маюць на мэце не кампрамэтаваць Рым, а якраз бараніць аўтарытэт Сьвяцейшага Айца перад расейскімі служкамі, каб не выкарыстоўвалі яго для нячэсных палітычных мэтаў. Я… не магу спакойна глядзець на тое, як služкі расейскага імпэрыялізму прадзерліся са сваімі ненасытнымі асьпірацыямі аж да найвышэйшага царкоўнага аўтарытэту. Уважаю, што найвышшы час даць ім такі адпор, на які заслужылі».

Востры абмен думкамі, відаць, быў патрэбны, каб разрадзіць напругу: ён зусім не пашкодзіў прыяцельскім дачыненьням Гарошкі і Слоскана і памог гэтаму апошняму зразумець становішча беларусаў.

Верны шматвяковай традыцыі, Рым публічна не прызнаў сваёй памылкі. Тым ня менш пратэсты і дамаганьні не засталіся незаўважанымі. Слоскана ня вызвалілі ад абавязкаў візытатара для расейцаў, але пра гэта пакрысе быццам забыліся. У беларускіх часопісах «Божым шляхам» і «Зьніч» зьявіліся афіцыйныя паведамленьні пра ягонае прызначэньне візытатарам для беларусаў (ня згадваючы зусім пра расейцаў). 14 лютага Кансыстарыяльная Кангрэгацыя ад імя Папскай Камісіі для эмігрантаў прызначыла Слоскана Дырэктарам місіянэраў для беларускіх эмігрантаў у Заходняй Эўропе, такім чынам даючы яму юрысдыкцыю над беларускімі каталікамі рымскага (лацінскага) абраду. З нагоды ягонага 60-годзьдзя ў «Зьнічы» зьявіўся пра яго артыкул, а «Божым шляхам» пачаў друкаваць (у рэдакцыі айца Гарошкі) успаміны Слоскана з 20-х і пачатку 30-х гадоў, г.зн. з часоў ягонай працы ў Беларусі і зьняволеньня ў савецкіх турмах і лягерах.

У 1954 годзе айцец Францішак Чарняўскі пераехаў з Францыі ў Бэльгію. Ён жыў у абацтве Мон-Сэзар у Лювэне, выконваў абавязкі беларускага сакратара біскупа Слоскана і займаўся пастырскай дзейнасьцю сярод беларусаў у Бэльгіі і паўночнай Францыі. Беларускія каталіцкія студэнты Лювэнскага ўнівэрсытэту прыходзілі ўраніцы прыслугоўваць Слоскану да імшы.

Біскуп Слоскан прысутнічаў амаль на ўсіх тыднях студыяў БАКА «Рунь», цікавіўся беларускімі студэнтамі багаслоўя (сэмінарыстамі), што рыхтаваліся да сьвятарства.

У 1960 годзе ён адыграў значную ролю ў справе біскупства Чэслава Сіповіча.

У 1953 годзе аўтар гэтых радкоў наважыўся стаць сьвятаром і напісаў у гэтай справе заяву ва Ўсходнюю Кангрэгацыю ў Рыме. У тым часе Рым быў адзіным месцам у Заходняй Эўропе, дзе месьціліся ўстановы (калегіі) для ўзгадаваньня «ўсходніх» сьвятароў. Ня маючы ніякай ахвоты ісьці ў «Русікум», куды звычайна пасылалі беларускіх студэнтаў, ён прасіў, каб яго прынялі ў Грэцкую калегію, якая мела моцныя гістарычныя сувязі зь Беларусьсю з часоў Уніі. Ён аддаў заяву ў рукі айца Сіповіча, але той меў некаторыя сумневы. Айцец Чэслаў пісаў айцу Гарошку 9 траўня 1953 году: «А.Надсон ужо злажыў на мае рукі заяву аб уступленьні ў Грэцкую калегію ў Рым. Ён жадае пайсьці на сьвецкага сьвятара. Гэта яго собскае рашэньне, і хай Бог багаславіць. Усё ж такі пакуль што я затрымаю яго заяву і пачакаю на твае заўвагі ў гэтай справе». Гарошка адказаў 12 траўня: «Калі Надсон злажыў заяву ў Грэцкую Калегію, дык і падавай яе па адрасе. Выбар вельмі добры, і няма патрэбы над гэтым доўга разважаць». Усходняя Кангрэгацыя задаволіла просьбу безь ніякіх цяжкасьцяў. Гэта яшчэ адзін малы доказ, што стаўленьне да беларусаў у Рыме зьмянілася.

*Друкуецца скарочана.*

**Прэзэнтацыя кнігі, што выходзіць у выдавецтве «Тэхналёгія», адбудзецца 8 сьнежня ў дольнай залі Чырвонага касьцёлу з удзелам а.Аляксандра Надсана. Пачатак у 18.00.**

# Гены пальцам не размажаш

## з пачутага ад настаўнікаў

У вячэрняй школе праверка ўсеагульнага навучаньня. Правяраючая цікавіцца лёсам непаўналетняга вучня, адлічанага са школы. У адказ завуч працягвае даведку з папраўчай калёніі. Правяраючая ўсьцешана:

— Ну хоць недзе прыстроіўся!

* * *

Дырэктар вячэрняй школы расказвае настаўнікам пра подзьвігі двух вучняў, якія ня так даўно вярнуліся з зоны:

— Яны ж за адну ноч пятнаццаць кіёскаў паднялі.

Пажылая настаўніца фізікі:

— От шустрыя хлопцы!

* * *

Настаўніца пра занадта праблемнага вучня:

— Божухна! Ён жа нідзе не падзенецца. Ён застанецца тут і ажэніцца, і ягоныя дзеці таксама будуць хадзіць у нашу школу!

Прагноз цалкам спраўдзіўся.

* * *

Гены пальцам не размажаш.

* * *

Мэтадыст перадавых поглядаў на сэмінары:

— Ну ня хоча Грыша з Туголіцы вучыцца! Ён любіць іграць на гітары. Дык пасадзіце яго ў школьным двары, і няхай сабе грае, абы ня ўлез нікуды.

* * *

Жыцьцё сучаснай школы: вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца…

* * *

Радкі з сачыненьняў (стыль аўтараў захаваны):

«Калі я вырасту, ня буду піць гарэлку і курыць, буду старацца працаваць і зарабляць грошы. А калі грошай ня хопіць, дык вазьму іх у бацькі».

«Праваслаўная рэлігія вельмі дапамагае жыхарам Беларусі і іншым праваслаўным краінам. Людзі, якія вераць у бога, жывуць спакайней і думаюць, што бог адгародзіць іх ад злых духаў. Яны робяць добрыя справы і памагаюць бедным зь лішоным шчасьцем. За свае грошы ставяць цэрквы і храмы, каб змацаваць на якімнебудзь месцы праваслаўную веру».

* * *

Настаўніца расейскай літаратуры пытаецца ў неахвочага да чытаньня дзевяціклясьніка:

— Колькі кніг мастацкай літаратуры ты прачытаў за сваё жыцьцё?

Вучань маўчыць. Пахваліцца няма чым. Затое ягo аднаклясьніца не губляецца:

— А што такое мастацкая літаратура?

* * *

Урок матэматыкі ў пачатковых клясах вясковай беларускамоўнай школы. Настаўніца:

— Дзеці, хто жыве на лікавай прамой? (Адказ — лічбы.)

Першы вучань:

— Я там не жыву.

Другі:

— І я там не жыву.

Трэці, паказваючы на суседа па парце:

— Ён там жыве!

* * *

Настаўніца:

— Дзеці, заўтра ў нас будзе спаборніцтва. Эмблемаю нашай каманды будзе Чабурашка. Хто можа яго намаляваць?

— Сярожаў бацька! Татуіроўкі робіць, дык што, Чабурашкі не намалюе?

* * *

Вучань вячэрняй школы ўдзельнічаў у групавым рабаваньні. Адседзеў чатыры месяцы ў СІЗА. На судзе атрымаў умоўны тэрмін. У першы дзень знаходжаньня ў школе болей за ўсё баяўся двойкі за дыктоўку. Сьлёзна прасіў ня ставіць адзнакі.

* * *

На іспытах па беларускай літаратуры за курс сярэдняй школы вучань, як ні пакутаваў, прадэманстраваць свае веды так і ня здолеў. Экзамэнатар зьлітаваўся:

— Прачытай любы верш на памяць па-беларуску.

Хлопец падышоў бліжэй да стала прыёмнай камісіі і засьпяваў:

— Касіў Ясь канюшыну…

**Тацяна Барысік, Магілёў**

Аляксандар Ворвуль



# Слоўнік скептыка

**Забабоны** — аскепкі ісьцін мінулага.

**Забыўлівасьць** — пасьпяховае ігнараваньне таго, што ня вельмі хочацца помніць.

**Задумлівасьць** — паэтычная манера ні пра што ня думаць.

**Зайздрасьць** — сьведчаньне таго, што ёсьць і тыя, каму горш за цябе.

**Закаханасьць** — доўгая прадмова да кароткага раману.

**Закон** — крышталізацыя забабонаў грамадзтва.

**Заляцаньне** — гульня, у якой мужчыны ўдаюць шчырасьць, а жанчыны — сарамлівасьць.

**Зарплата** — яшчэ адзін доказ таго, што працаваць на іншых нявыгадна.

**Засяроджанасьць** — тое, чаго так не хапае, калі чытаеш у туалеце.

**Заўтра** — дзень, да якога можна і не дажыць, калі ўсё адкладаць на заўтра.

**Зборы касавыя** — рэжысэр большасьці амэрыканскіх фільмаў.

**Зброя** — рэч, якая дапамагае людзям не разумець адзін аднаго лепей.

**Здаровы** — хворы, які адмаўляецца ад ускрыцьця.

**Здароўе** — гэта калі ясі тое, чаго ня любіш, п'еш тое, што не падабаецца, і робіш тое, чаго ня хочаш.

**Злачынства** — намаганьне грамадзяніна зрабіць тое, што дазволена толькі ўраду.

**Злы** — той, хто пачынае помсьціць раней, чым яго пакрыўдзілі.

**Змаганьне за мір** — сэкс за цнатлівасьць.

**Зрок** — удасканалены слых.

**Зубачыстка** — сымбаль старасьці.

**Зубр** — тое, што можа здарыцца з каровай бяз пэўнага месца жыхарства.

**ЗША** — гэта там, дзе так хораша, што так табе, дурню, і трэба.

**Зямля** — глёбус у маштабе 1:1.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Арлоў У. Каханак яе вялікасьці: (Гістарычныя апавяданьні, эсэ).** — Менск: Логвінаў, 2004. — 252 с. 500 ас.

У кнігу папулярнага пісьменьніка ўвайшлі ўжо вядомыя і новыя апавяданьні, дзеяньне якіх разгортваецца ў розныя эпохі.

**Шпаковский В., Николе Д. Русская армия 1250—1500** / Пер. с анг. В. Г. Яковлева; Худ. А. К. Макбрайд. — М.: ТАА «Издательство АСТ», ТАА «Издательство Астрель», 2004. — 54 с., 8 кал. іл. — (Ваенна-гістарычная сэрыя «Солдатъ».) 5000 ас.

Кніга будзе цікавай для гісторыкаў, сяброў рыцарскіх клюбаў і ўсіх тых, хто цікавіцца ўзбраеньнем часоў Вялікага Княства Літоўскага. У кнізе друкуюцца рэканструкцыі ўзбраеньня вояў Полацкага і Наваградзкага княстваў, ВКЛ. Цана 24000.

**Катовіч А., Крук Я. Зімовыя сьвяты.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 199 с. — (Беларускі народны каляндар). 2000 ас.

Гэтай кнігай распачынаецца сэрыя, прысьвечаная беларускаму народнаму календару, беларускім сьвятам, сьвяточным стравам і інш. Цана каля 6000.

**Купрейчик В., Царенков Н. Игра без компромисса:** Пособие по шахматам. Магілёў: Магілёўская ўзбуйненая друкарня імя Сьвярдлова, 2004. — 68 с. 1000 ас.

У кнізе сабраныя прыклады творчасьці гросмайстра Віктара Купрэйчыка пачынаючы з 1960-х і да нашых дзён. Бракуе талковых камэнтароў.

**Сяргей Лескець, Тацяна Вабішчэвіч**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Украінская антыглябалісцкая рэвалюцыя

Працяг са старонкі 4.

Тыя, хто не пайшоў на панэль, прапаноўваюць вельмі сьмешныя канцэпты падтрымкі Юшчанкі: «…Мы змагаемся не за канкрэтнага кандыдата, а за саму зьмену ўлады і прыход новых сіл з новымі падыходамі. Гэтыя новыя сілы будуць з часам таксама пераможаны з мэтай іх паляпшэньня ды прыходу яшчэ лепшых сіл, і так да таго часу, пакуль нацыяналісты ня прыйдуць да ўлады». (Мсьціслаў Квітэнь, «Моладзевы нацыянальны кангрэс»).

Прырода электарату Юшчанкі больш цікавая, чым калдырная формула «дэмакратыя супраць дыктатуры». Трэба пачаць з таго, што апошні ўздым эканомікі ў Кітаі выклікаў шалёную каньюнктуру на рынку сталі. Прычым у выніку таго, што індустрыя патрабуе велізарных інвэстыцый у экалягічныя мерапрыемствы, цэнтры мэталюргіі перамясьціліся з Захаду і ЗША на пэрыфэрыю — у Бразылію, Расею, Украіну. Аднак калі ў Расеі алігархі ляжаць пад газавікамі, ва Ўкраіне яны сталі фактарам палітыкі. Іх стратэгічная задача — прывесьці краіну ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю (СГА), каб стварыць адпаведныя макраэканамічныя перадумовы для экспарту сталі. Але такая эканамічная палітыка азначае каюк для няэкспарта-арыентаваных галін эканомікі, якія зацікаўлены ў росьце ўнутранага рынку.

Адсюль канцэнтрацыя вакол Юшчанкі сярэдняй і дробнай буржуазіі. Адсюль грошы на два буйныя тэлеэкраны на Майдане Незалежнасьці, якія дазваляюць утрымлівацца натоўп, калі на дварэ —10°.

Натуральна, гэтую буржуазію падтрымлівае кіеўская бюракратыя, якой прыход данецкіх у структуры ўлады нічога добрага не абяцае. Адсюль дазвол мэра Амельчанкі на правядзеньне ў цэнтры гораду бестэрміновага мітынгу пры поўнай ляяльнасьці мянтоў.

Відавочна, тут інтэлігенцыя і студэнты. Іх шакуе нахабны стыль новых данецкіх блатных. Гэта маса, неабходная для акцый.

Нарэшце, эстэтычную афарбоўку і дыскурс усяму гэтаму блёку зноў даў культурны Львоў, дзе традыцыйна ня любяць усіх, хто ліжа вядомае месца Маскве.

І, як вынік, абсалютна нечаканы «рысарджымэнта» ўкраінскага нацыяналізму. Праўда, цяпер гэта ўжо ня кола ідэалістаў-інтэлектуалаў, а нешта накшталт руху «трэцяга саслоўя» ў часы Францускай рэвалюцыі. Як і тады, праўда, ён не ўключае ў сябе пралетарыят. Шахцёры і мэталюргі Ўсходу па іроніі гісторыі сталі бастыёнам буйнога бізнэсу.

Цікава, што такая сытуацыя — канфлікт паміж экспарта- і ўнутранаарыентаванымі прадпрыемствамі — па ходзе глябалізацыі відавочна паўстане і ў Беларусі. Беларускім нацыяналістам варта павучыцца ва ўкраінскіх калег, як шукаць сацыяльную базу, а не насіцца з харугвамі ВКЛ. Калі ўсё добра абставіць, насіць іх будуць самі дырэктары заводаў і фабрык.

**Лёлік Ушкін**

## Андрэй Хадановіч



### Леаніды

Нібы дасланыя ў космас лістом прыатачаным,
прыходзяць назад, як вірус ад дэманаў неба,
у сэнсе —
часам яны вяртаюцца, зноў вяртаючы нам
імёны генсекаў і нашых паэтаў на пэнсіі.

Не спачуваюць часовай радасьці й гору,
хуткай мілосьці, да руху сьвятла гатовай.
І застывае погляд, кінуты ўгору,
перад вандроўкай, лічы, мільёнагадовай.

Руляць глыбока ўверсе, і там, з адхлані,
нам люструюць сьвятло, як камень на персьні,
быццам бы кажучы, што любое пасланьне
часам знойдзе адказ, калі не замерзьне.

*20—21 лістапада 2004*




КАІСА

# Робаты б'юць па самалюбстве

Каб існаваў баромэтар шахматнай актыўнасьці, яго стрэлкі ў восеньскія месяцы, напэўна, зашкалілі б. Клюбны чэмпіянат Эўропы, матч за першынство ў сьвеце, сусьветная алімпіяда, чэмпіянат Менску, сэанс, дадзены нястомным Віктарам Купрэйчыкам у Смаргоні… У пачатку кастрычніка пераможца Каспарава Ўладзімер Крамнік захаваў сваю годнасьць, згуляўшы ў Швайцарыі 7:7 з Пэтэрам Лекам. Ня менш інтрыгоўнае спаборніцтва прайшло ў гішпанскім Більбао.

Першы чэмпіянат зямной кулі з адначасовым удзелам чалавечых істот і кампутарных праграм запомніцца ня толькі яго протаганістам. Весялін Тапалаў, Руслан Панамароў і Сяргей Каракін (наймаладзейшы ў сьвеце ўкраінскі гросмайстар — просьба ня блытаць ні з Калякіным, ні з Курохіным!) у чатырох турах змагаліся супраць электронных монстраў зь мянушкамі «Гідра», «Дып Джуніёр» і «Фрыц-8». Вынік для «гросаў» несуцяшальны: 3,5 на 8,5. Машыны перайгравалі людзей ва ўсіх дэбютах. Адно Каракіну ўдалося выйграць партыю ў «Джуніёра».

Прэзыдэнт міжнароднай асацыяцыі кампутарных гульняў Дэвід Леві вынікам здаволены: партыі былі нашмат цікавейшымі, чым у Крамніка зь Лекам, якія дазвалялі сабе «гросмайстарскія» нічыі. Паглядзець было на што: асабліва бліскучым падаўся выступ «Гідры» на 16 хуткасных працэсарах, што месьціцца ў Арабскіх Эміратах. У першым жа туры 16-галовае дзіва літаральна раздушыла пазыцыю Панамарова, украінскага экс-чэмпіёна сьвету ФІДЭ… Найхутчэй, пасьля таго як кампутар здолее даць сэанс адначасовай гульні першаму тузіну шахматыстаў сьвету і выйграць зь лікам, аналягічным більбаоскаму, ад супольных паядынкаў адмовяцца — сэнсу ў спаборніцтве бегуноў з аўтамабілістамі ні на каліва. Пакуль жа баталіі чалавека з кампутарам вырашана працягваць, не за гарамі другі «зьмяшаны» чэмпіянат.

**Вольф Рубінчык,**
**rubinchyk@lycos.com**

### Як бы вы згулялі?



**Р. Панамароў — «Hydra». Більбао, 2004. Ход чорных.**

**Як чорным завяршыць атаку?**

Адказ: 1...Ке3! 2. fe Се3+ 3. Крh2 (не ратавала і 3. Ке3) 3...Сf2! 4. gh e3! з ідэяй 5...e2. Белыя здаліся.

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую Андруся Мельнікава** з Днём народзінаў. Генадзь

**Алесь Шалахоўскі**, з днём народзінаў. Веру ў рэальнасьць тваіх дзівосных мар. Анатоль

**Віншую слуцакоў** і ўсіх шчырых беларусаў са сьвятам Слуцкага збройнага чыну. Сяржук

### КАНТАКТЫ

**Пазнаёмлюся** зь беларускамоўным мужчынам 35—55 гадоў, з в/а, нежанатым, мэтанакіраваным, пажадана навукоўцам. А/с 91, Менск-88. Сьвятлана

**2 сьнежня будзе 70-я** гадавіна сьмерці майго прадзеда беларускага мовазнаўца Мікалая Шатэрніка. Калі хто мае матэрыялы пра яго, просьба пазваніць па тэлефоне 264-80-52. Усяслаў Шатэрнік

**«Малады фронт»!** Далучайся! Т.: 755-69-90, вэб-сайт: mfront.net

**Спадарства**! Шукаем месца (кавярня, рэстарацыя) для ладжаньня дзён народзінаў, дзіцячых сьвятаў зь беларускамоўным вядоўцам. Т.: 288-68-91. Ігар і Ганна (пасьля 19-й)

**Увага!** Штосуботу з 11.00 да 15.00 пры клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») працуе гандлёва-абменны пункт беларускай музыкі. Вас чакаюць сустрэчы зь вядомымі музыкамі, знаёмства з аднадумцамі, музычныя навінкі, прадукцыя па самых танных цэнах, квіткі на канцэрты і шмат іншага. Даведкі: 241-24-74, 766-24-25 (Янак)

**Штосацьвер** у офісе ТБМ (пл.Перамогі, вул. Румянцава,13) адбываюцца пасяджэньні фан-клюбу беларускай музыкі. Цікавыя сустрэчы, новыя знаёмствы, канкрэтная дзейнасьць. Пачатак а 18-й

### КНІГІ

**Новыя нумары** «Arche», «Каханак яе вялікасьці» У.Арлова, поўны збор твораў У.Караткевіча (т.1, 2, 4—8), «Нацыяналізм у XX ст.» Э.Сьміта, іншыя кнігі. Слоўнікі, дапаможнікі, калядныя паштоўкі, аўдыё, відэа, CD, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ) з панядзелка па пятніцу (12.30—19.00). Т.: 8-029-707-40-01

**Прадам кнігі:** «Беларускі эпас» 1953 г., «Эканамічная гісторыя Беларусі» 1966, «Гісторыя культуры Беларусі» 1996 г, «Археалёгія і нумізматыка Беларусі», У.Галубок «Творы», Я.Пушча «Творы», паэзія і інш. Т.: 8-029-753-70-05

**Прадам кнігі:** Я.Сямашка «Армія Краёва», «Наша Ніва» 1906—1908 г., «Энцыкляпэдыя Беларусі», т.1—4, энцыкляпэдыя «Беларусь» 1995 г., энцыкляпэдыя «Беларусь у гады ВАВ», «Беларускі арнамэнт», аўт. Кацар (вялікі фармат) ды інш. Т.: 8-029-753-70-05

**Куплю кнігу** І.Марзалюка «Людзі даўняй Беларусі». Т.: 243-98-10, Натальля

**Куплю** «Беларускую энцыкляпэдыю», т. 1—3 і 6—7; «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі», т. 4, 5. Т.: 613-70-85, Алесь

**Запрашаем у падарожжа**

**28 лістапада** (нядзеля) «**Замкі Беларусі**»: **Мір—Наваградак—Любча—Ліда—Менск**. 20000

**5 сьнежня** (нядзеля)

**Горадня з заездам у Мураванку**. 21000

Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**Прадам кнігі:** Я.Сямашка «Армія Краёва», энцыкляпэдыі «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне», «Археалёгія і нумізматыка», «Архітэктура Беларусі», «Этнаграфія Беларусі». Т.: 236-02-15

### ПАКОЙ

**Дзьве дзяўчыны** здымуць танна пакой на працяглы тэрмін. Т.: 8-029-336-67-36

### ПРАЦА

**Шукаю** навуковую, выкладчыцкую, рэдактарскую працу, зьвязаную зь беларускай мовай, або творчую. Т.: 236-13-38

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Выказваем** спачуваньне Алесю Пушкіну з нагоды сьмерці маці. Андрусь і Генадзь

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У артыкуле «Пэн застаецца ў краіне» (№43) дапушчана прыкрая памылка. Згаданы «Сяргей» ня ўздзельнічаў у таргах і не зьяўляўся тым мужчынам, які набыў ювэлірныя выробы. Прыношу свае прабачэньні.

**Алесь Кудрыцкі**

Наша Ніва
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
карэктарка — Настасься Мацяш
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32,**
**8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3499. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 24.11.2004.
Замова № 7178.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а